**Рэцэнзент:**
дырэктар дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі “Пастаўскі раённы цэнтр дзяцей і моладзі” Л.М.Пушкар
складальнік:
метадыст мастацкага профілю А.В.Малькевіч

Друкуецца па рашэнні
педагагічнага савета дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі
“Пастаўскі раённы цэнтр дзяцей і моладзі”

**Зборнік метадычных матэрыялаў «Выкарыстанне элементаў этнакультуры ў дзейнасці дзіцячых аб’яднанняў па інтарэсах мастацкага профілю»:** / Складальнік: А.В.Малькевіч; Пастаўскі раённы цэнтр дзяцей і моладзі. - Паставы , РЦДзМ, 2015. – 50 с.

Зборнік прысвечаны пытанню выкарыстання этнакультурнага кампанента ў дзейнасці аб’яднанняў па інтарэсах мастацкага профілю і метадычныя парады па дадзенай праблематыцы.

Рэкамендуецца кіраўнікам установаў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, метадыстам, педагогам аб’яднанняў па інтарэсах мастацкага профілю.

Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі “Пастаўскі раённы цэнтр дзяцей і моладзі”

**Змест**


| | | |
|---|---|---|
| | Уводзіны | **с.3** |
| I. **Этнакультурны кампанент ў дзейнасці аб’яднанняў на інтарэсах мастацкага профілю** | | **с.6** |
| | 1. Выкарыстанне этнакультурных элементаў у дзейнасці аб’яднанняў на інтарэсах дэкаратыўна-прыкладной творчасці | **с.9** |
| | 2. Выкарыстанне этнакультурных элементаў у дзейнасці аб’яднанняў на інтарэсах музычна-харэаграфічнай творчасці | **с.16** |
| | 3. Фальклорнае свята ў сістэме сродкаў этнакультурнага выхавання | **с.17** |
| II. **Выкарыстанне этнакультурных элементаў пры правядзенні масавых мерапрыемстваў** | | **с.37** |
| III. **Народныя гульні як элемент этнакультуры ў дзейнасці аб’яднанняў па інтарэсах мастацкага профілю** | | **с.47** |
| | Заключэнне | **с.51** |
| | Літаратура для выкарыстання | **с.53** |
| | Літаратура | **с.54** |

# Уводзіны

Мэта адукацыі сёння – развіццё асобы, якое прадугледжвае стварэнне ўмоў для выхавання культуры чалавека, фарміравання структуры яго каштоўнасцей.

Суб’ектная пазіцыя навучэнца ва ўзаемаадносінах з культурай і яго права самому выбіраць каштоўнасці ў агульначалавечым досведзе, безумоўна, мае значэнне, аднак не трэба забываць, што размова ідзе аб асобе, якая толькі фарміруецца, якая мае недастатковы тэарэтычны кругагляд, эмацыянальна-эстэтычны вопыт, з няўстойлівымі ўстаноўкамі і арыенцірамі. Падлетак ў значна большай ступені, чым дарослы, пападае пад уплыў ультрасучасных стыляў у мастацтве, знешніх форм зносін. Ён схільны апеляваць меркаваннямі “аўтарытэтаў” з ліку равеснікаў і хутка адаптавацца да групавых інтарэсаў і пераваг. Яго эстэтычнае ўсведамленне адкрыта для ўсяго яркага, знешне эфектнага (тэлешоу, баявікі, фільмы жахаў і інш.), усяго дынамічнага (поп-,біт-, рок-музыка). Пры гэтым духоўна-маральныя і эстэтычныя аспекты ўспрымання нярэдка застаюцца “за кадрам”. У сувязі з гэтым узнікае неабходнасць пошуку эфектыўных шляхоў і сродкаў развіцця духоўнай сферы падрастаючага пакалення. У гэтым плане набывае значнасць выхаванне эстэтычнай культуры, якая з’яўляецца паказчыкам высокага развіцця асобы і дазваляе ёй не толькі паўнацэнна мець зносіны з прыгожым, але і актыўна ўдзельнічаць у яго стварэнні.

Шматвекавы педагагічны вопыт нашых продкаў пераконвае ў выхаваўчай эфектыўнасці этнакультурных традыцый свайго народа. Пабудаванне выхаваўчай работы на традыцыях этнічнай культуры надае ёй гуманістычны характар, садзейнічае фарміраванню эстэтычных і маральных катэгорый прыгожага, духоўна-маральнай устойлівасці, грамадзянска-патрыятычнай пазіцыі, этнічнага адзінства. Вяртанне да вытокаў прабуджае ў навучэнцаў генетычную памяць, забяспечвае пераемнасць пакаленняў, садзейнічае значнаму павышэнню выніковасці выхаваўчага працэсу.

Выхаванне, заснаванае на этнакультурных традыцыях, арыентавана на развіццё і сацыялізацыю асобы як суб’екта пэўнага этнаса і прадстаўніка сусветнай супольнасці, здольнага да самавызначэння ва ўмовах сучаснай цывілізацыі. Яно прызванае рашаць трыадзіную задачу: *у этнакультурным плане – выхаванне асобы, носьбіта пэўнай культуры з высокім узроўнем этнічнай самасвядомасці; у міжкультурным – фарміраванне асобы, якая ведае і паважае культуры іншых народаў; у полікультурным – далучэнне да агульначалавечых культурных каштоўнасцей.* Залежыць этнакультурнае выхаванне ад таго, наколькі ўлічваюцца асаблівасці характару, выхавання, паводзін, побыту прадстаўнікоў канкрэтнага этнасу, а эфектыўнасць навучання – ад таго, наколькі яно будзе заснавана на каштоўнасцях і праявах нацыянальнага менталітэту і культуры.

У этнакультурны кампанент зместу адукацыйнага працэсу ўваходзіць усё багацце этнакультуры, сістэма жыццезабеспячэння, традыцыі, стэрэатыпы паводзін, духоўныя мэты і каштоўнасці, напоўненыя новым сучасным зместам,

які забяспечвае прымірэнне традыцыйных каштоўнасцей з універсальнымі, стандартызаванымі каштоўнасцямі, атрыманымі з дапамогай сучасных тэхналогій. Асабісты вопыт – асаблівы від зместу адукацыі. Навучанне ўяўляе сабой сферу “перадачы” розных відаў вопыту: арыентыровачнага (веды), дзейнаснага (уменні), творчага, культурнага. Усе гэтыя віды вопыту, акумуліраваныя ў культуры, у выніку становяцца вопытам навучэнца. Асабісты вопыт – вопыт спецыфічнай дзейнасці чалавека па стварэнню свайго асабістага асяроддзя, асабістай самаарганізацыі, таго, што ў паўсядзённым жыцці называюць унутраным светам чалавека. Гэта элемент чалавечай культуры – культуры асэнсавання сваіх перажыванняў і ў цэлым асабістага жыцця, упраўлення сваімі пачуццямі і намерамі, пабудавання праграм жыццядзейнасці, пераадольвання жыццёвых калізій, звязаных, як правіла, з узаемадзеяннем з іншымі асобамі.

Сярод устаноў адукацыі і арганізацый, якія працуюць з дзяцьмі і моладдзю, менавіта ўстановы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, дзякуючы сваёй варыятыўнасці і пластычнасці, здольныя найлепшым чынам ажыццявіць выхаванне эстэтычнай культуры падрастаючага пакалення з дапамогай актуалізацыі этнакультурных традыцый, вяртання да гістарычных вытокаў. Установы дадатковай адукацыі – неад’емная частка сістэмы агульнай адукацыі дзяцей, яны прызваныя забяспечыць дадатковыя магчымасці для самавызначэння асобы, стварыць умовы для яе самарэалізацыі, духоўнага, інтэлектуальнага і фізічнага развіцця, задавальнення творчых і адукацыйных патрэбнасцяў асобы. Установы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі маюць вялікія магчымасці развіцця дзіцячай творчасці па ўсіх напрамках адукацыйна-творчай дзейнасці. Сёння яны з’яўляюцца комплексным цэнтрам, які вядзе шырокую асветніцкую работу па далучэнню падрастаючага пакалення да нацыянальнай культуры, звычаяў і традыцый роднага краю, да яго духоўных і маральна-эстэтычных каштоўнасцей, які ўзмацняе псіхафізічныя сілы, аднаўляе здароўе і творчы патэнцыял выхаванцаў, які рацыянальна арганізоўвае вольны час дзяцей і падлеткаў.

Гісторыя культуры, мастацкія каштоўнасці твораў мастацтва – жывапісу, архітэктуры, музыкі, літаратуры, пачынаючы з народных казак, паданняў, легенд да высокіх узораў прозы і паэзіі – з’яўляюцца багацейшай крыніцай гуманізму, развіцця маральных і эстэтычных каштоўнасцей. Культурна-гістарычныя традыцыі, іх дыялектычнае адзінства з агульначалавечай культурай павінны стаць крыніцай фарміравання зместу адукацыі, усёй выхаваўчай дзейнасці ўстановы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

Новы змест дадатковай адукацыі эвалюцыйна інтэгрыруецца ў традыцыйныя адукацыйныя праграмы, якія змяняюцца і ўдасканальваюцца. Такі падыход прадугледжвае стварэнне адукацыйнай сістэмы, пры якой сродкам адукацыі з’яўляецца этнакультурная спадчына, а змест адукацыі выводзіць асобу на высокі ўзровень эстэтычнай выхаванасці праз этнічную, беларускую і сусветную прастору.

# I. Этнакультурны кампанент ў дзейнасці аб’яднанняў на інтарэсах мастацкага профілю

Мастацтва як сродак выхавання выкарыстоўвалася з даўніх часоў. Менавіта праз мастацтва, якое з’яўляецца адным са значных элементаў эстэтычнага ўспрымання свету, чалавек адчыняе для сябе свет мастацкіх вобразаў. І сёння адным з найбольш папулярных і запатрабаваных у дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі з’яўляецца мастацкі напрамак, таму менавіта ён павінен іграць галоўную ролю ў рашэнні праблем выхавання эстэтычнай культуры навучэнцаў установы дадатковай адукацыі. Вывучэнне народных традыцый развівае беражлівыя адносіны да помнікаў, да багацця народнай культуры. Так прадухіляюцца спажывецкія адносіны да культуры. Дзеці становяцца знатакамі, захавальнікамі, транслятарамі культурных традыцый, тварцамі культурных каштоўнасцей.

У змест дадатковай адукацыі мастацкага профілю ўключаюцца:

1. традыцыі, культура, веды аб духоўных і матэрыяльных каштоўнасцях, створаных многімі пакаленнямі;
2. глыбока вывучаюцца філасофскае асэнсаванне родным народам праблем быцця, яго погляды на прыроду, эстэтыку, чалавека, сэнс і прызначэнне жыцця;
3. этнакультурны змест адукацыі ўтрымлівае вывучэнне роднай мовы і літаратуры, гісторыі народа, вуснай народнай творчасці, сацыяльнага, культурнага, экалагічнага асяроддзя, музычнага, выяўленчага мастацтва, дамаводства, народных промыслаў;
4. сістэматычнае вывучэнне фальклора, які канцэнтрыруе ў сабе ўвесь перажыты этнасам гістарычны вопыт і выражае ўстойлівыя ўяўленні аб эстэтычнай каштоўнасці этнасу.

У сучаснай установе дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі развіваюцца розныя віды мастацкай дзейнасці: спевы (сольныя, вакальныя, народныя, эстрадныя, акадэмічныя), іграа на музычных інструментах, харэаграфія (народная, класічная, сучасная), фальклорныя ансамблі, аркестры, тэатральная дзейнасць, выяўленчае мастацтва, дэкаратыўна-прыкладная творчасць і іншыя. Аднак, як паказвае практыка, заняткі па інтарэсах этнакультурнага напрамку карыстаюцца меншым попытам, чым заняткі, якія абапіраюцца на сучаснасць. Напрыклад, займацца ў студыі эстраднага вакалу або сучаснай харэаграфіі ці паперапластыкі значна больш жадаючых, чым у фальклорным аб’яднанні. Разам з тым, многім дзецям родная мова падаецца непрыгожай і складанай, вырабы народных майстроў – смешнымі і незразумелымі. Непрыняцце этнакультурнай спадчыны выклікана недастатковым эстэтычным выхаваннем праз “паглыбленне” у этнакультуру.

Сістэма выхавання, пры ўключэнні этнакультурных каштоўнасцей у адукацыйны працэс, павінна выкарыстоўваць найбольш эфектыўныя падыходы сучаснай педагагічнай тэорыі і практыкі. Зразумела, значнае месца адведзена стварэнню і ўключэнню ў адукацыйны працэс традыцыйных і аўтарскіх іннавацыйных праграм, заснаваных на этнакультурным кампаненце. Аднак,

гэтага недастаткова. Структурны змест этнакультуры дазваляе выкарыстоўваць этнічную спадчыну ў аб'яднаннях па інтарэсах абсалютна розных напрамкаў. Таму мае сэнс больш шырокае выкарыстанне этнакультурных традыцый ва ўстановах дадатковай адукацыі, мэце эстэтычнага выхавання павінен служыць кожны занятак, кожнае мерапрыемства, асяроддзе дзіцяці.

**Структурная мадэль этнакультуры**




Арганізацыя выхаваўчай работы на традыцыях этнічнай культуры ва ўстанове дадатковай адукацыі павінна будавацца з пазіцыі сістэмнага падыходу, на міждысцыплінарным узроўні, з улікам усяго шматвобразззя фактараў, якія

ўплываюць на яе станаўленне. Народная мастацкая культура Беларусі вызначае аснову і змест этнакультурнага выхавання з выкарыстаннем ўсіх яе складальнікаў: музычнага фальклору, народных рамёстваў, каляндарна-абрадавых святаў, народных гульняў, бытавых танцаў і карагодаў для фарміравання цэласных уяўленняў аб этнакультурных асаблівасцях свайго народу.

**Структурна** арганізацыя этнакультурнай выхаваўчай работы з дзяцьмі і моладдзю вядзецца па трох напрамках:

- вывучэнне і прыманне гісторыі і культуры свайго народа;
- ідэнтыфікацыя з сапраўдным і канструктыўная дзейнасць па яго ўдасканальванню;
- бачанне бліжэйшай і далёкай будучыні для сябе і супольнасці.

Этнакультурны кампанент, які ўваходзіць у змест дзейнасці аб’яднанняў па інтарэсах мастацкага напрамку, падаецца праз:

1. ***этнакультурны вучэбны матэрыял*** у адпаведнасці з асноўным (тыпавым) зместам адукацыйных праграм;
2. ***скразныя тэмы этнічнай культуры***, якія вывучаюцца адначасова ў розных аб’яднаннях па інтарэсах: напрыклад, тэма роднай прыроды ў творчасці беларускіх пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў; абрад “Зажынкі”; народныя традыцыі; нацыянальныя святы;
3. ***этнакультурную інфармацыю як дадатак*** да асноўнага зместу асобнага занятку.

Змест выхаваўчага ўздзеяння вызначаецца наступнымі **задачамі**:

- азнаямленне з гісторыяй і традыцыямі свайго народа;
- азнаямленне з гісторыяй і традыцыямі народаў, якія складаюць этнакультурнае наваколле;
- адраджэнне традыцыйных промыслаў і рамёстваў;
- папулярызацыя творчасці, вывучэнне абрадаў і народных гульняў;
- аналіз і выяўленне агульнага, выключнага і асаблівага ў культуры, традыцыях і гісторыі народаў, якія пражываюць на суседніх тэрыторыях.

Важнай задачай педагогаў дадатковай адукацыі з’яўляецца не толькі навучыць ведаць і разумець, але і аналізоўваць веды аб этнічных культурах, знаходзіць і прызнаваць у іх агульнае і адрознае. Працэс асэнсавання павінен грунтавацца на пазітыўным успрыманні усіх этнасаў і крытычных адносінах да інцыдэнтаў і канфліктаў на нацыянальнай падставе.

У фарміраванні маральна-эстэтычных якасцей, што грунтуюцца на далучэнні да этнічнай культуры ўмоўна можна вылучыць наступныя **этапы**:

а) успрыманне этнічнай культуры;
б) засваенне этнакультурных ведаў;
в) фарміраванне этнакультурных установак;
г) фарміраванне этнакультурных поглядаў;
д) арганізацыя дзейнасці ў рамках этнічнай культуры.

У сваёй дзейнасці навучэнцы не застаюцца ізаляванымі ў выбраным фрагменце этнакультуры: дзейнасць педагогаў дадатковай адукацыі накіравана

прадэманстрыраваць яму магчымасці іх выкарыстання ў сучасным сацыяльна-культурным працэсе. Гэтаму садзейнічаюць:

- гульнявы прынцып засваення інфармацыі, звяртанне да тэатралізацыі;
- асэнсаванае следванне прынцыпам вуснай народнай творчасці;
- стварэнне пазітыўнага псіхалагічнага рэагавання з улікам узроставых і індывідуальных асаблівасцей навучэнцаў;
- рэгламентацыя мерапрыемстваў законамі каляндарна-земляробчай і сямейна-бытавой цыклізацыі;
- работа над асэнсаваннем і засваеннем не толькі прызначэння элемента этнічнай культуры, але і яго маральна-эстэтычнай каштоўнасці і практычнай абумоўленасці.

## 1. Выкарыстанне этнакультурных элементаў у дзейнасці аб'яднанняў на інтарэсах дэкаратыўна-прыкладной творчасці

Дэкаратыўна-прыкладная творчасць з'яўляецца адным са старэйшых носьбітаў этнічнай культуры. Існуе шэраг аб'яднанняў па інтарэсах, заснаваных на этнакультурнай спадчыне беларускага народа. Пляценне з саломкі, вырабы з гліны, традыцыйная беларуская вышыўка займаюць значнае месца ў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Разам з тым, інтэгрыраванне на занятках этнакультурных кампанентаў розных краін і традыцый дае магчамасць не толькі параўнаць, але і асэнсаваць значнасць роднай этнакультуры ў сусветным супольніцтве.

**Прыклады планавання тэматыкі і зместу заняткаў у аб'яднаннях па інтарэсах "Мастацкая вышыўка"**

| Тэма і змест заняткаў у адпаведнасці з адукацыйнай праграмай | Этнакультурны кампанент тэмы |
|---|---|
| Знаёмства з прасцейшымі відамі швоў. Віды швоў: уперад іголку; за іголку; строчка; пяцельны; козлік; бархатны; сцябліністы; ланцужковы. | Шматвобраззе беларускай народнай вышыўкі. Руская традыцыйная вышыўка. Вызначэнне падабенства і адрознення, асаблівасцей кожнай вышыўкі |
| Знаёмства са свабоднымі вышыўкамі. "Пышачка"; "лісток" , "кветка"; калачыкі; дзіркі; вузялкі; павуцінка. | Выкарыстанне вышыўкі ў традыцыйным беларускім адзенні, у адзенні іншых народаў |

| | |
|---|---|
| Знаёмства з вышыўкамі пад лік. Крыжык; двайны крыжык; складаны ўзор. | Вышыўка ў тэхніцы “набор”. Упрыгожванне адзення вышыўка беларускага арнаменту |
| Знаёмства з прасцейшымі відамі гладдзевых швоў | Аздабленне адзення беларускім арнаментам, вышытым гладдзю |
| Знаёмства з вышыўкай бісерам | Маляваныя дываны Віцебскага паазер’я. Вышыўка бісерам элементаў раслінна-арнаментальнага аздаблення малянак |
| Знаёмства з вышыўкай тасьмой | Маляваныя дываны Віцебскага паазер’я. Вышыўка тасьмой матываў малянак |

**Прыклады планавання тэматыкі і зместу заняткаў у аб’яднаннях па інтарэсах “Макрамэ”**

| **Тэма і змест заняткаў у адпаведнасці з адукацыйнай праграмай** | **Этнакультурны кампанент тэмы** |
|---|---|
| Вывучэнне спосабаў пляцення і вузлоў, прыёмаў ручнога ткацтва | Беларускія традыцыйныя віды дэкаратыўна-прыкладной дзейнасці. Беларускія традыцыйныя паясы |
| Знаёмства з упрыгожваннямі і ўзорамі з вузлоў | Беларускія традыцыйныя ўпрыгожванні. Пляценне скроневых кольцаў |
| Выкарыстанне пляцення пры вырабе цацак з цеста. Распрацоўка і выраб цацак з салёнага цеста з падвязкамі з ланцужкоў | Беларускія гліняныя сувеніры. Распрацоўка і выраб цацак з салёнага цеста на аснове беларускіх гліняных цацак |
| Рэпсавы вузел | Беларускі арнамент. Пляценне узораў беларускага арнаменту рэпсавымі вузламі |
| Модныя ўзоры.Пляценне ўзораў з нітак. | Беларускі арнамент. Упрыгожванні з ўзорамі беларускага арнаменту. |
| Модныя ўзоры. Пляценне пояса са шнура | Беларускі арнамент. Аздабленне пояса ўзорамі беларускага арнаменту |

## Фрагмент занятку аб’яднання па інтарэсах “Макрамэ”

***Тэма:*** Рэпсавы вузел
***Этнакультурны кампанент:*** Беларускі арнамент. Пляценне узораў беларускага арнаменту рэпсавымі вузламі
***Мэты і задачы:***
- садзейнічаць фарміраванню эстэтычнага густу навучэнцаў, пашырэнню агульнага кругагляду дзяцей, іх ведаў у вобласці народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;
- стварэнне ўмоў для развіцця творчых здольнасцей навучэнцаў;
- выхаванне цікавасці і павагі да культурнай спадчыны.

***Узрост навучэнцаў*:** 9-11 гадоў
***Абсталяванне:*** схемы з адлюстраваннем тэхнікі выканання рэпсавага вузла, адлюстраванні вырабаў з выкарыстаннем рэпсавых вузлоў, малюнкі элементаў беларускага арнамента, вырабы з нітак, ніткі для пляцення, нажніцы

***1.Тлумачэнне новага матэрыялу***

Адным з самых папулярных вузлоў у тэхніцы макрамэ з’яўляецца рэпсавы вузел. Называюць яго яшчэ двайным або бісерным. Нават можна сказаць, што гэта самы папулярны вузел. І не дарэмна. Ёсць шмат вырабаў, выкананных аднымі толькі рэпсавымі вузламі. Можна рабіць вельмі тугое пляценне, шчыльна размяшчаючы ніткі. Так плятуць невялічкія дываны.

(*Дзеці разглядваюць вырабы)*

Паверхня такіх дыванкоў мае характэрную асаблівасць: яна ўся складзена з выпукклых бугаркоў. У пляценні іх называюць брыдамі. У залежнасці ад напрамку ніткі асновы, можна выконваць гарызантальныя, вертыкальныя або дыяганальныя брыды.

*(Расказ суправаджаецца паказам нагляднага матэрыялу)*

***2.Знаёмства з тэхнікай выканання рэпсавага вузла. Выкананне трэніровачных практыкаванняў на шнурах***

***3.Увядзенне этнакультурнага кампанента***

Зараз я прапаную выканаць пляценне дыванка з узорам беларускага арнаменту.

Якія ж узоры можна ўбачыць у беларускім арнаменце і што яны азначаюць?

Трэба многа знаць,
каб узор прачытаць.
Ці светлым сонцам,
ці хатнім аконцам,
ці вешчай кукушкай,
ці мяккай падушкай,

ці яркаю зоркай,
ці ўдавою горкай,
ці спорым святам,
ці родным братам,
ці роднай сястрыцай,
ці светлай крыніцай,
ці зарой-зараніцай,
ці добрай маладзіцай,
ці краснай дзявіцай,
ці свежай вадзіцай.

Што ні ўзор - то сімвал. Сонца, Зямля, Жыццё. Сімвалы ўраджаю: Спарыш, Рай, Багач. Яны вучаць любіць Маці-Зямлю, працу, дабівацца добрага ўраджаю. Сімвалы святаў: Купала, Каляда, Масленіца, Вялікдзень. Тут - радасць, весялосць, гонар за вынікі сялянскай працы. Сімвалы памяці: Дзяды, Радаўніца, любоў і павага да продкаў…

*(Расказ суправаджаецца паказам нагляднага матэрыялу)*

***4.Практычная работа.*** Дзеці выбіраюць матыў арнаменту і выконваюць работу па схеме.

***Парада:*** лепш напачатку выканаць пляценне больш простых узораў( Зямлі, Сонца).

***Матэрыялы для выкарыстання***

У беларускім арнаменце можна вылучыць некалькі асноўных матываў.

*Вобразы ўраджаю і ўрадлівасці*. Галоўнай крыніцай існавання людзей на зямлі былі жывёлагадоўля і земляробства. Іх адлюстраванне – сімвал багацця і дабрабыту. Тут мы знойдзем вобраз Ярылы-Юрая, бога ўрадлівасці і жыццёвых сіл прыроды, якога прасілі аб добрым ураджаі ці ягонага хрысціянскага двайніка Юрыя. вобразы Жыценя, Жытняй бабы, Спарыша, Рая, Багача (ці дажынкавага снопу), Палявіка, Дажджа, Вялікага Сонца, Маці Зямлі-Карміцелькі, і канешне, Хлеба, як сімвалу дастатка і дабрабыту.

*Вобразы маці*. У арнаментах вобраз Маці сустракаецца ў трох варыянтах: у выглядзе жаночай фігуры, у выглядзе абмаляванай гірляндаю зоркі і у выглядзе схематычнага дрэва. Нярэдка вобраз суправаджаўся сімваламі сонца, месяца, агню, ветру, што падкрэслівала раўназначнасць гэтых вобразаў.

*Вобразы роднай Беларусі*. Звычайна гэта быў узор скампанаваны з квадратаў і кругоў, што сімвалізавала сонца і зямлю. Існавалі таксама матывы ракі (папярэчныя палосы, якія нагадваюць рабізну на вадзе), вады (быццам кругі на вадзе, але складзеныя з прамавугольных кірпічыкаў), лесу, дубровы

(звычайна некалькі радоў пазнальных матываў магутных дрэваў), поле, лугу (кветкі ўсіх магчымых колераў), жывёлаў, птушак.

*Вобразы святаў*. Вялікдзень, Купалле, Каляды, Масленіца і шмат іншых святаў знайшлі сваё адлюстраванне ў арнаментах. Выкарыстанне ручнікоў, абрусаў і іншых твораў у такія дні з такімі ўзорамі было звязана з магіяй, адмысловымі рытуаламі.

*Вобразы яднання песень і кветак, мелодыі і арнаменту*. Гэтыя дзіўныя на першы погляд вобразы звязаныя з любоўю беларусаў да песень і музыкі, са звычкай пець пад час працы і адпачынку. Часцей за ўсё майстрыхі звязвалі вобраз музыкі з рознымі карункавымі вырабамі ці з выявалі кветак і птушак.

*Вобразы язычніцкай міфалогіі*. Галоўныя вобразы тут – Бог Сонца і Багіня Маці-Зямля, бо яны нарадзілі людзей і ўсю прыроду, па вераваннях старажытных славянаў. Але не былі забытыя і іншыя богі і увасабленні прыроды, такія як Дамавік, Палявік, Вадзянік, Лесавік.

*Вобразы кахання*. Тут былі сумныя вобразы жаночай долі, русалкі (апошняя досыць умоўная ўвыглядзе букета кветак) і даволі гарэзлівыя вобразы фізічнай блізкасці мужчыны і жанчыны. Распаўсюджаным арнаментам была дзяучына з поднятымі рукамі, якая трымае каласы і кветкі – Лада, багіня кахання і прыгажосці.

*Вобразы чалавека, сям'і, дзяржавы*. Сімвал чалавека васьміканцовая зорка – адзін з самых пашыраных сімвалаў у беларусаў. Бярозка ці рабіна – вобраз дзяўчыны, клён (явар) – хлопца. Сям'я – чатыры крыжападобна спалучаныя разеткі, нярэдка ў арнаментальнай аблямоўцы.

*Вобразы веры*. Перш за ўсё гэта сімвалы продкаў. На Беларусі заўсёды шанавалі дзядоў, перад памерлымі не было страху, пабачыць іх у сне не лічылася дрэннай прыкметай – наадварот – у іх прасілі дапамогі, рады, іх запрашалі на сямейныя святы. Сімвал агульнага продка – два перакрыжаваных прамавугольніка, унутры – маленькі крыжык. Сімвал роднага дзеда – крыж з чатырох квадратаў.

Акрамя гэтых сімвалаў у арнаментах беларусаў можна знайсці ўзоры душы (васьміканцовая разетка са скругленымі канцамі), узоры гаданняў, мараў, надзей.

**Узоры беларускага арнаменту,**
**якія можна выкарыстоўваць для пляцення дыванка**
**рэпсавымі вузламі**

 Багач

 Жытняя баба



Варажба

 Жаночая доля

 Жыцень

 Зямля абуджаецца вясною

 Зямля

 Маці-Радзіцельніца

 Песня

 Русалка

 Сонца



Спарыш





Хлеб Чалавек

Ярыла

## Прыклад выкарыстання элементаў этнакультуры ў аб’яднанні па інтарэсах “Канструяванне і мадэліраванне адзення”

У наш час слова “мода” ўвайшло ў лексікон кожнага чалавека. Гэта слова ўжываецца на тэлебачанні, не сыходзіць са старонак журналаў і газет, мы гаворам пра моду, пачынаючы з дзіцячага сада. Аб’яднанні па інтарэсах, накіраваныя на стварэнне аўтарскага авангарднага адзення, маюць шырокія магчымасці для выкарыстання этнакультурнага кампанента ў сваёй дзейнасці. Адной з найбольш цікавых форм арганізацыі выхаваўчай дзейнасці, накіраванай на вывучэнне этнічнай культуры, для дадзеных аб’яднанняў з’яўляецца праектная дзейнасць.

***Праект “Нацыянальныя касцюмы”***



***Мэта праекта:*** знаёмства з нацыянальнымі касцюмамі беларусаў і народаў суседніх краін, стварэнне сваёй мадэлі нацыянальнага касцюма.

***Задачы праекта:***

– пазнаёміцца з нацыянальнымі касцюмамі беларусаў і суседніх краін, з нацыянальнымі строямі розных абласцей Беларусі; вызначыць падабенства і асаблівасці нацыянальных касцюмаў беларусаў і іх суседзяў;

– садзейнічаць далучэнню дзяцей і моладзі да этнакультурных каштоўнасцей, вывучэнню традыцый сваёй Радзімы;

тыўныя формы ўзаемадзеяння з сем’ямі навучэнцаў праз прыцягненне іх да сумеснай рэалізацыі праекта этнакультурнага накірунку, павысіць ролю сям’і ў адукацыйным працэсе;

– стварыць умовы для арганізацыі змястоўнага адпачынку і карыснай занятасці навучэнцаў, стварэння творчай атмасферы для работы з адоранымі дзецьмі.

Праект можа складацца з некалькіх узаемазвязаных блокаў.

Механізм рэалізацыі ўключае:

- збор матэрыялаў;
- стварэнне альбома, прэзентацыі;



- правядзенне выставы і конкурсу малюнкаў;
- арганізацыю творчых сустрэч, экскурсій, тэматычных канферэнцый;
- стварэнне сваёй мадэлі нацыянальнага касцюма.

У ходзе рэалізацыі праекта навучэнцы ствараюць цэлыя калекцыі аўтарскіх мадэляў касцюмаў. Паказ калекцый адбываецца ў час правядзення канцэртных праграм не толькі на базе цэнтра, але і на раённым узроўні.

## 2. Выкарыстанне этнакультурных элементаў у дзейнасці аб'яднанняў на інтарэсах музычна-харэаграфічнай творчасці

Вялікае значэнне мае выкарыстанне этнакультурнага падыходу ў музычнай адукацыі. Этнакультурны падыход да музычнай адукацыі – гэта падыход, заснаваны на прынцыпе этнакультурнасці, культуратворчасці, талерантнасці, сувязі адукацыі з этнакультурнай асветніцкай практыкай і этнакультурным асяроддзем, які забяспечвае напраўленнасць музычнай адукацыі на засваенне падрастаючым пакаленнем этнамузычных каштоўнасцей з мэтай фарміравання асабістай этнамузычнай культуры, этнамузычнай кампетэнтнасці, талерантнасці, станаўленне этнічнай самасвядомасці, арганічнае ўваходжанне ў склад сусветнай музычнай культуры.

Народная музыка, танцы, музычныя інструменты – усё гэта і сёння з'яўляецца элементамі выхавання эстэтычнай культуры сучасных школьнікаў. На занятках аб'яднанняў па інтарэсах музычна-харэаграфічнай творчасці навучэнцы засвойваюць народныя маральныя і эстэтычныя ідэалы, этнамузычныя каштоўнасці, атрымліваюць звесткі аб гісторыі, побыце, жанрах народнага музычнага мастацтва, фарміруюць навыкі выканання народных песень, засвойваюць прасцейшыя формы этнічнага мнагагалосся, навыкі выканання народных танцавальных рухаў.

Этнакультурны матэрыял на занятках па інтарэсах музычна-харэаграфічный творчасці можа з'яўляцца:

- асноўным (у адпаведнасці з тыпавым зместам адукацыйнай праграмы);
- часткай скразной этнакультурнай тэмы, якая вывучаецца адначасова ў розных аб'яднаннях па інтарэсах;
- дадатакам да асноўнага зместу асобнага занятку.

Народная песня, якая адносіцца да найбольш старажытных узораў музычна-паэтычнай творчасці, займае асобае месца ў музычнай спадчыне беларусаў. На працягу многіх вякоў знаўцы і захавальнікі песенных скарбаў беларускага народа перадавалі песні з вуснаў у вусны. Усе свае пачуцці беларусы давяралі песні, праз песню вучылі дзяцей дабрыні, справядлівасці, у песні выражалі свае мары і спадзяванні.

Слухаючы народныя песні, дзеці атрымліваюць ўрокі эстэтыкі: прывучаюцца да мілагучнасці роднай мовы, адзначаюць яе рытм, рыфмы, пявучасць, паступова авалодваюць эстэтычным поглядам на жыццё.

Асобую ўвагу педагогам дадатковай адукацыі трэба ўдзяляць падбору песеннага матэрыялу. Менавіта праз змест песень, што ўваходзяць у рэпертуар, рэалізуецца, у асноўным, этнакультурны напрамак адукацыйнага працэсу. Педагогі цэнтра дзяцей і моладзі, якія працуюць у дадзеным напрамку, павінны выкарыстоўваюць песні беларускіх аўтараў на роднай мове, песні пра Радзіму, выконваць беларускія народныя і сучасныя песні, знаёміцца з народнымі песнямі краін-суседзяў.

У агульнай музычнай адукацыі этнакультурны кампанент заўсёды ўваходзіў у змест заняткаў у выглядзе фрагментнага звароту да народных песень. Аднак для выхавання эстэтычнай культуры школьніка недастаткова фрагментальнае ўжыванне этнамузычных элементаў. Неабходна сварэнне этнаарыентаванага адукацыйнага, інфармацыйнага, музычна-асветніцкага асяроддзя. Этнакультурны матэрыял, які вывучаецца на занятках аб’яднанняў на інтарэсах музычна-харэаграфічнай творчасці, павінен шырока выкарыстоўвацца пры правядзенні канцэртаў, масавых мерапрыемстваў, фальклорных і традыцыйных свят.

## 3. Фальклорнае свята ў сістэме сродкаў этнакультурнага выхавання

Свята – асобая жыццёвая сітуацыя навучэнца, калі ён без павучанняў і папрокаў атрымлівае ўрокі сацыяльных зносін, калі ў ім праяўляюцца і замацоўваюцца лепшыя чалавечыя якасці. Унікальнае выхаваўчае значэнне свята заключаецца ў тым, што яно дае магчымасць для актыўнага самавыражэння, магчымасць для самасцвярджэння ў канструктыўнай сацыяльна-карыснай дзейнасці.

Святы ў вёсцы мінулага складалі значны бок грамадзянскага і сямейнага жыцця. Яны ўключаліся ў адзіную многаступенчатую паслядоўнасць, спраўляліся з году ў год, са стагоддзя ў стагоддзе ў пэўным парадку, устаноўленым традыцыяй. Сяляне нават гаварылі: “Мы цэлы год працуем для свята”. Свята – час для адпачынку, вяселля, радасці, адчування паўнаты жыцця, час, калі людзі адчувалі сябе часткай агульнага згрунтавання.

Фальклорнае свята, як ні адна іншая форма дзейнасці, аб’ядноўвае ў сабе розныя віды мастацтва: музыку, мастацкае слова, танец, драматызацыю, дэкаратыўна-прыкладную творчасць, выяўленчае мастацтва. Яно з’яўляецца сінтэзам кампанентаў этнічнай культуры. Шматвобразныя выхаваўчыя функцыі массавых народных свят абумоўліваюць мэтазгоднасць шырокага выкарыстання гэтай формы эстэтычнага ўздзеяння на падрастаючае пакаленне.

Для ўстановы дадатковай адукацыі найбольш натуральнымі будуць тыя святы, у якіх традыцыйна прымаюць удзел усе дзеці. Гэта, напрыклад, “сустрэча вясны”, дзе дзецям адводзіцца роля заклікальнікаў, яны водзяць карагоды, спяваюць пестаўкі і іх адорваюць кулічамі (печывам у выглядзе птушак). Важным элементам падрыхтоўкі да такога свята з’яўляецца падключэнне да гэтага працэсу бацькоў. Сумесная мастацкая творчасць бацькоў

і дзяцей – напрыклад, выраб з цеста розных птушак – нясе не толькі адукацыйную, але і важную выхаваўчую нагрузку.

Стварэнне адпаведнага настрою на тое ці іншае свята ў многім залежыць ад старанна складзенай праграмы: педагог прадумвае тэму, форму праграмы, падбірае музычна-літаратурны матэрыял, удзяляе ўвагу сюрпрызным момантам, мастацкаму афармленню, размяркоўвае заданні па падрыхтоўцы паміж аб'яднаннямі па інтарэсах. Падрыхтоўка ўключае і псіхалагічны настрой на стварэнне радаснай і добразычлівай атмасферы паміж усімі ўдзельнікамі.

Арганізатары каляндарна-абрадавых свят, павінны ўлічваць, што свята – актыўныя зносіны вучняў паміж сабой і дарослымі, іх творчы ўдзел ва ўрачыстасці. У час падрыхтоўкі да каляндарна-абрадавага свята актуалізуецца і разгортваецца фальклорна-краязнаўчая дзейнасць, пашыраецца сфера ўжывання роднай мовы, прапагандыруецца нацыянальная культура, народныя танцы і спевы, адраджаюцца традыцыі роднага краю, што і стварае атмасферу нацыянальнага адзінства.

**Прыклад размеркавання заданняў па падрыхтоўцы да фальклорнага свята паміж аб'яднаннямі па інтарэсах мастацкага профілю**

| | Музычна-літаратурны матэрыял (рыхтуюць навучэнцы заняткаў па інтарэсах музычна-харэаграфічнага і тэатральнага напрамкаў) | Нагляднасці (рыхтуюць навучэнцы заняткаў па інтарэсах ДПТ і выяўленчага мастацтва) | Віды дзейнасці (рыхтуюць навучэнцы заняткаў па інтарэсах музычна-харэаграфічнага і тэатральнага напрамкаў) |
|---|---|---|---|
| АСЯНІНЫ | Загадкі, песні, прыказкі, вершы пра восень, пра назвы месяцаў, гульні. | Рэпрадукцыі карцін восені розных аўтараў, малюнкі на асеннюю тэматыку | Выкананне песен, музычна-рытмічных рухаў, карагодных і танцавальных рухаў, чытанне вершаў, гульні |
| КАЛЯДЫ | Вершы, песні да Каляд, калядкі | Калядная зорка, батлейка, паданне аб Езусе, маскі і касцюмы для калядавання | Выкананне песен, музычна-рытмічных рухаў, карагодных і танцавальных рухаў, чытанне вершаў, гульні |

| | | | |
|---|---|---|---|
| В Я Л І К Д З Е Н Ь | Вялікодныя песні, вершы | Рэпрадукцыі карцін да Вялікдня, малюнкі вялікоднага яйка, сувеніры | Выкананне песен, музычна-рытмічных рухаў, карагодных і танцавальных рухаў, чытанне вершаў, гульні |

Сучасныя святы і абрады багата насычаны народнай мастацкай самадзейнасцю. У народнай культуры можна сустрэць розныя формы свят: святы-канцэрты, святы-спяктаклі. Такія святы прыносяць радасць, уцеху тым, хто на іх прыходзіць, як глядач, і не меншую радасць і задавальненне тым, хто з’яўляецца артыстамі.

## Свята “Купальскі карагод” у аб’яднаннях па інтарэсах мастацкага профілю

У аснове ўсёй купальскай абраднасці ляжыць пакланенне нашых прашчураў сонцу (агню), вадзе і расліннасці. Святкаванне Купалля звычайна адбывалася на традыцыйным рытуальным месцы, на якім вясковая абшчына яшчэ са старадаўніх часоў адзначала найбольш значныя падзеі. У розных рэгіёнах рассялення беларусаў гэта магло быць узбярэжжа ракі ці возера, а калі побач не было вады, то выбіраліся на які-небудзь пагорак, невялікую палянку або проста на ўскраіну гаю.

У традыцыйнай народнай культуры склаўся пэўны тып народнага свята і пэўны набор абавязковых элементаў (рытуалаў). Для Купалля традыцыйнымі з’яўляюцца наступныя моманты свята:

1. Абход двароў і запрашэнне на Купалле (моладзь).
2. Збор кветак, лекавых траў і карэнняў, якія набывалі ў гэту ноч асаблівую сілу, віццё вянкоў (дзяўчаты, жанчыны).
3. Падрыхтоўка пляцоўкі да свята і вогнішча на ёй (хлопцы).
4. Гатаванне абрадавых страў.
5. Рытуальнае запальванне вогнішча, песні і карагоды ля яго, якія не сціхаюць да раніцы і перамяжоўваюцца гульнямі, скокамі, гушканнем на арэлях (усе жыхары вёскі).
6. Сумесная вячэра ля вогнішчаў.
7. Пошукі папараць-кветкі (хлопцы), абарона ад нячыстай сілы.
8. Ачышчэнне агнём (праз купальскае вогнішча скакалі, у ім спальвалі кола-"сонца", адзенне хворых, старыя рэчы), раслінамі, вадой — купанне на досвітку ў рацэ ці возеры, у расе.
9. Варажба з вянкамі, раслінамі.
10. Сустрэча ўзыходзячага сонца.
11. Бясчынствы ў вёсцы, каб перагарадзіць дарогу нячыстай сіле.

Пры складанні сцэнарыю неабходна ўключыць неабходныя традыцыйныя элементы свята, прадумаць адпаведныя касцюмы, прадугледзіць конкурсную праграму для ўсіх катэгорый удзельнікаў (дзяцей і дарослых).

Перад самым пачаткам свята магчыма арганізаваць беларускі кірмаш па продажу разнастайных беларускіх сувеніраў, народных вырабаў, беларускіх ласункаў. Усё гэта музычна афармляецца сродкамі народных спеваў па меры магчымасці. Больш просты варыянт музычнага афармлення – выкарыстанне электратэхнічных сродкаў, але з рэпертуарам беларускіх мелодый.

***Падрыхтоўчая работа.*** Навучэнцы аб’яднанняў па інтарэсах рыхтуюць наступны матэрыял:

- паведамленне, як святкавалі Купалле ранней; жарты, гульні – навучэнцы аб’яднанняў па інтарэсах фальклорнага напрамку;
- купальскія песні – навучэнцы аб’яднанняў па інтарэсах фальклорнага і музычна-харэаграфічнага напрамкаў;
- купальскія вянкі, выставу лекавых траў (можна малюнкаў лекавых траў), сувеніры, вырабы для кірмашу – навучэнцы аб’яднанняў па інтарэсах дэкаратыўна-прыкладнога напрамку.

Бацькам прапануецца падабраць месца для правядзення заняткаў (зялёная паляна ў парку, садзе, лясочку, луг і г. д.), дапамагчы дзецям у падрыхтоўцы купальскага карагода.

***<u>Прыкладны змест свята.</u>***

### *Першы этап. "Купалле"*

*Дзеці ў вяночках з зёлкамі ў руках співаюць песню:*

Купальская ночка кароткая,
Сонейка, сонейка, сонейка рана
ўсходзіла.
Рана ўсходзіла, поле асвяціла,
Дзевак, хлопцаў будзіла,
Работу давала — у поле насылала,
Каб хлопчыкі агні палілі,
Поле свяцілі, жыта пільнавалі,
Каб ведзьмы заломаў не ламалі,
У кароў малака не адбіралі...



*Усе ўладкоўваюцца на паляне, а вядучы або педагог дадатковай адукацыі расказвае:*

– Адным з найбольш яскравых, маляўнічых і паэтычных абрадаў у беларусаў было свята Купалле. Яно захавалася і да нашых дзён разам з цудоўнымі купальскімі песнямі. Наогул, у старажытнасці ва ўсходніх славян самымі важнымі былі святы вясенне-летняга цыкла. Купалле падводзіла рысу доўгім дням (сонца паварочвала на лета, а лета — на спякоту) і аб'ядноўвала ў сабе ўсе

культы, абрады і звычаі, якія сустракаліся раней. Свята гэта вельмі папулярнае не толькі ў Беларусі, але і ва ўсёй Еўропе, яно аграрна-земляробчае. Пасля Купалля праз пяць дзён наступае Пятро, пачынаецца пакос, а затым і жніво.
Свята па старому стылю спраўлялі з 23 на 24 чэрвеня, па новаму — з 6 на 7 ліпеня.
*(з кнігі: Купальскі абрад / Беларускія народныя абрады. Складальнік і навуковы рэдактар Л. П. Касцюкавец. — Мн., 1994. - С. 69.)*

### *Другі этап. "Звычаі і абрады"*

Вядучы просіць дзяцей расказаць пра звычаі і абрады, якіх прытрымліваюцца людзі на Купалле. Напрыклад: ноччу раскладваюць вогнішчы, весяляцца, пускаюць па вадзе вянкі, збіраюць лекавыя травы, вешаюць на дзвярах стойлаў для жывёл крапіву. Навучэнцам дапамагаюць дарослыя, запрошаныя на свята.

Вядучы дадае, што яшчэ з раніцы 6 ліпеня напярэдадні свята Купалля дзяўчаты і жанчыны з песнямі накіроўваліся ў поле, на луг, каб назбіраць купальскіх зёлак. Збіралі васількі, руту, багаткі, браткі, папаратнік, салодку, купалінкі. І абавязкова увесь час спявалі. Згодна з народнымі павер'ямі, спевы ў час збору траў і кветак надавалі ім лекавую і цудадзейную моц. Пра гэты святочны абрад гаворыцца і ў купальскіх песнях.

*(з кнігі: Коваль У. І., Новак В. С. Беларускія народныя святы і звычаі. — Гомель, 1993. — С. 67):*
Ой, на Купалле, на Яна,
Дзевачкі зелле збіралі.
Яны збіралі, не знали,
У старога дзеда пыталі:
— Што гэта, дзядулька, за зелле,
Чорны галоўкі насенне?

Арганізуецца выстава лекавых траў. Хлопчыкі і дзяўчынкі, якім гэта было даручана, расказваюць пра лекавыя ўласцівасці некаторых траў, дэманструюць трыпутнік, рамонак, сухацвет (бяссмертнік) і інш. Вядучы дадае, што сабраныя напярэдадні свята зёлкі асвячаліся ў царкве, каб потым іх можна было выкарыстоўваць для лячэння хвароб людзей, жывёл, а таксама для чарадзейства. Паводле павер'я, хто захоўвае дома такія зёлкі, тых абыходзяць ведзьмы.

Людзі верылі, што лопух, крапіва, палын і да т. п. ахоўваюць у гэтую ноч і людзей, і хаты, і хлявы ад ведзьмаў і іншых злых духаў. Не выпадкова лопух утыкалі ў стрэхі дамоў, з палыну рабілі паясы, каб не балела спіна. Акрамя



таго, палын уплятали ў вянкі і насілі і з сабою ў якасці засцярогі ад русалак і ведзьмаў.

*Варыянт: падрыхтаваныя вянкі дзяўчынка Купалінка разам з сяброўкамі даруюць усім удзельнікам свята (адзяваюць на галаву).*

### Трэці этап. "Папараць-кветка"

*Дзеці разам з дарослымі разглядаюць папаратнік або выяву расліны. Вядучы расказвае:*

— Папараць, як гаворыць павер'е, цвіце толькі ў ноч на Купалу. Цвіце адно імгненне. Кветачкі яе гараць, як іскрынкі. Знайсці і сарваць гэтыя кветкі вельмі цяжка, бо нячыстая сіла стварае розныя перашкоды... Лёгка знаходзіць і збіраць гэтыя папараць-кветкі можа толькі купальскі дзядок. Ён ходзіць па лесе з кошыкам і напаўняе яго дзівоснымі кветкамі. Калі сустрэцца з дзядком і разаслаць перад ім белы абрус, то ён кіне на абрус адну кветку. Тады трэба хутчэй браць яе і, разрэзаўшы далонь правай рукі, класці пад скуру: адтуль нячысты кветку не дастане.

Людзі верылі ў тое, што кветка гэтай прыгожай расліны дапаможа ім авалодаць зямным багаццем. Але хіба такое можа атрымацца без працы? Безумоўна, не. Ды і ўвогуле: папараць на самай справе не цвіце.

### Чацвёрты этап. "Вогнішча"

Трэба адзначыць, што спрадвеку купальскае свята было звязана не толькі з культам раслін. Вялікае значэнне надавалася агню, менавіта купальскі агонь з'яўляўся своеасаблівым ахоўна-магічным ачышчальным сродкам.

Распальваецца вогнішча, каля яго арганізуюцца карагоды, танцы. Гучаць песні.



Напрыклад:
Танцуй, Мацей,
Не шкадуй лапцей.
А як ліпа зацвіце
Бацька новыя спляце.
Біце, біце у цымбалы
— Не зважайце, што я малы,
Дуйце, дуйце, у жалейкі,
Не шкадуйце, што маленькі.

Ля вогнішча праводзяцца гульні "Палачка-шукалачка", "Баба-Яга" і іншыя. Купальскі карагод працягваецца. Дзяўчынкі пускаюць вянкі па вадзе. Пераклікаюцца, выкарыстоўваючы радкі з народных прымавак, напрыклад:

— Ты, Купалле, ты, зялёнае,
Дзе дасюль было?
— За ракою расло.
— А што рабіла?
— Красавалася...

***Парады арганізатарам:***
1. Не шкадуйце патраціць на правядзенне свята некалькі дзён летніх канікул. Гэта будзе добрай нагодай усім (дзецям, бацькам, педагогам) сустрэцца, расказаць пра адпачынак, парадавацца адзін за аднаго.
2. Абавязкова запрасіце на свята бацькоў, бабуль, дзядуль, братоў і сясцёр дзяцей, дайце бацькам невялікія даручэнні па падрыхтоўцы купальскага карагода.
3. Асаблівую ўвагу дзяцей звярніце на традыцыі, звычаі беларусаў, але галоўнае — арганізуйце свята так, каб усе добра адпачылі, усвядомілі, што яны — часцінкі той садружнасці людзей, якая стварылася ва ўстанове адукацыі. Інакш кажучы, правядзіце своеасаблівы дзень здароўя дзяцей і старэйшых на ўлонні прыроды.
4. Ні ў якім разе не прымушайце навучэнцаў запамінаць усе назвы, традыцыі, звычаі. Хай на свяце дзеці будуць захоплены і зацікаўлены тым аповедам пра гісторыю беларускіх свят, які вы ім прапануеце.

## Этапы правядзення свята “Вялікдзень”

**Задачы:** далучаць навучэнцаў да самабытнай беларускай культуры;
выхоўваць любоў да роднага краю, да беларускай мовы.

**Падрыхтоўчая работа.** Навучэнцы аб’яднанняў па інтарэсах рыхтуюць наступны матэрыял:
- паведамленне, як святкавалі Вялікдзень ранней; вершы пра вясну, загадкі – навучэнцы аб’яднання па інтарэсах фальклорнага напрамку;
- валачобныя песні – навучэнцы аб’яднання па інтарэсах фальклорнага і музычна-харэаграфічнага напрамкаў;
- выставу малюнкаў і вырабаў на дадзеную тэматыку - навучэнцы аб’яднання па інтарэсах дэкаратыўна-прыкладнога напрамку.

### Першы этап. "Прыйшла вясна"

*Вядучы прапануе навучэнцам, якія падрыхтавалі загадкі пра вясну, сонца, загадаць іх. Усе разам спрабуюць знайсці адгадкі. Напрыклад:*

Дует теплый южный ветер,

Солнышко все ярче светит.
Снег худеет, быстро тает,
Грач горластый прилетает.
Что за месяц? Кто узнает?
(Март — сакавік.)

Яростно река ревёт
И разламывает лед.
В домик свой скворец вернулся.
В небе жаворонка трель.
Кто же к нам пришел?
(Апрель — красавік.)

*Вядучы просіць узгадаць народныя прыкметы, звязаныя з красавіком. Затым дадае:*

Красавік сініць і дзьме, бабам цяпло нясе, а мужык пазірае ды галавою ківае.

У красавіку грымот — цёплы будзе год.

У красавіку зямля прэе.

У красавіку дождж праходзіць, сонца грэе — тады ўсякі не збяднее.

*Даецца слова дзецям, якія падрыхтавалі вершы пра вясну.*

## Другі этап. "Вялікае свята"

*Вядучы заўважае, што вясной святкуецца цудоўнае свята Вялікдзень. Дзеці ўспамінаюць, як рыхтуюцца людзі да гэтага свята, якімі звычаямі і абрадамі суправаджаюць яго, у якія гульні гуляюць. Хтосьці з навучэнцаў расказвае:*

Падрыхтоўка да Вялікдня адбываецца на працягу Вялікоднага тыдня і заканчваецца ў Вялікую суботу прыгатаваннем святочнай ежы, якую многія нясуць у царкву, дзе яна асвячаецца падчас службы.

Пасля асвячэння пасхі ў царкве кожны гаспадар імкнуўся як мага хутчэй данесці яе дадому. Гэты звычай быў заснаваны на народным павер'і: хто першы прыбяжыць з пасхаю дадому, у таго будзе лепшы ўраджай і той гаспадар першым скончыць палявыя работы.

У сувязі з гэтым звычаем існавалі і некаторыя іншыя павер'і: хлеб будзе расці так хутка, як бяжыць з пасхай гаспадар; хто ўсіх абгоніць, у таго конь будзе самы дужы і цэлы год будзе першы ў рабоце.

Раніцай на Вялікдзень назіралі таксама, як "гуляе" сонца: паводле павер'я, яно ў гэты дзень быццам бы скача і пераліваецца ва ўласных промнях.

*Вядучы дае дзецям заданне: адгадаць загадку.*
Беленькая бочка,

На ёй ні сучочка,
Ні абручыка, ні дна,
Хоць бы клёпачка адна.
(Яйка.)



*Вядучы падагульняе:*

Сёння мы даведаліся, што сімвалам Вялікадня з'яўляецца пафарбаванае яйка. Паводле хрысціянскіх уяўленняў, велікоднае яйка сімвалізуе жыццё, перамогу жыцця над смерцю, а яго чырвоны колер нагадвае аб крыві Хрыста, якая пралілася дзеля выратавання людзей.

Па вяртанні з царквы свянцонымі яйкамі пачыналі святочны сняданак. У першы дзень Вялікдня лічылася неабходным мыцца вадою, у якую былі пакладзены залатыя і срэбраныя рэчы, а таксама чырвонае велікоднае яйка, каб увесь год быць багатым, здаровым і прыгожым. Матулі качалі чырвоныя яйкі па тварах сваіх дзяцей.



Ёсць яшчэ адзін цікавы абрад. Ён звязаны з валачобнікамі — велікоднымі спевакамі, якія хадзілі па вёсках на другі, трэці дзень Вялікдня. Ствараўся валачобны гурт, галоўным у ім быў запявала. У гурт уваходзілі музыкі, якія ігралі на скрыпцы і дудзе, а таксама чалавек, які насіў "валачобнае" — святочныя дарункі гурту. Валачобнікі абыходзілі ўсе хаты ў вёсцы і перад кожнай хатай спявалі, ухваляючы гаспадара, яго сям’ю, жадалі ім плённай працы, добрага ўраджаю, прыплоду жывёлы. У адказ гаспадары дзякавалі валачобнікам і давалі ім дарункі — "валачобнае" (фарбаваныя яйкі, каўбасы, сыры, булкі).

Выкананне валачобнага абраду, лічылася, спрыяе ўраджаю, дабрабыту сям'і, засцерагае ад розных няўзгод.

*Гучаць валачобныя песні. Вядучы звяртае ўвагу дзяцей на цікавы велікодны абрад Вітання.*

Свята прысвечана вяртанню да жыцця Ісуса Хрыста. Таму на Вялікдзень прынята вітацца: "Хрыстос уваскрос!". У адказ гавораць: "Сапраўды ўваскрос!".

## Трэці этап. "Гуляем — весялімся"



*Вядучы расказвае навучэнцам, што з велікоднага тыдня пачынаюцца летнія гулянні, карагоды ды інш.*

Гульні на Вялікдзень асаблівыя. Застаецца распаўсюджаным гульня ў “біткі”. Пераможцам гульні лічыцца той, у каго аказваецца найбольш моцнае яйка ("мацак"), ён становіцца ўладальнікам найбольшай колькасці разбітых яек. Не менш папулярным з'яўляецца качанне велікодных яек з горак, якое пачынаецца ў першы дзень Вялікдня і працягваецца цэлы тыдзень. Пераможцам у гэтай гульні лічыцца той, чыё яйка пакоціцца далей, чым у іншых удзельнікаў гульні.

*Можна арганізаваць з дзецьмі гульні "Ручаіна", "Баяры”, “А мы ў госці прыйшлі", павадзіць карагоды, паспяваць песні.*

***Парады арганізатарам:***

1. Лепш за ўсё гутарку правесці напярэдадні свята Вялікадня.
2. Абавязкова запрасіце на свята бацькоў і даручыце ім падрыхтаваць цікавыя апавяданні пра велікодныя абрады.
3. Звярніце ўвагу дзяцей на тое, што беларускі фальклор вылучаецца з фальклору іншых славянскіх народаў сваёй паэтычнасцю і мілагучнасцю менавіта дзякуючы валачобным песням.

## ***Велікодныя традыцыі ў розных краінах.***

Заўсёды цікава даведацца, як людзі ў іншых частках свету адзначаюць святы, што карыстаюцца папулярнасцю. Адным з такіх святаў з'яўляецца Вялікдзень. А чаму б і нам не запазычыць з іншых культур упадабаныя традыцыі для нашых велікодных святаў у коле сям'і?

У *Аўстраліі* асабліва папулярныя велікодныя яйкі розных памераў з шакаладу ці цукру. Яшчэ ў гэтай краіне велікодныя фігуркі любяць рабіць у выглядзе труса або жывёл аўстралійскага кантынента. Традыцыйнае велікоднае меню аўстралійцаў складаецца са смажанай бараніны, ялавічыны і піва з вялікай колькасцю гародніны (бульба, морква, гарбуз, фасоля, гарох або браколі). На дэсерт часцей за ўсё падаецца салодкая аўстралійская велікодная страва - торт з безэ, упрыгожаны садавінай: ківі, суніцамі, ананасамі і мандарынамі. Вялікую папулярнасць маюць салодкія гарачыя булачкі, якія аўстралійцы ядуць на сняданак у велікодную раніцу, перад абавязковым наведваннем царквы. На Вялікдзень у Аўстраліі мноства сямей выязджаюць на прыроду (на ўзбярэжжа ці ў горы), бо калі ў нас вясна - у іх канец лета і пачатак восені.

У *Балгарыі* Вялікдзень таксама карыстаецца поспехам. Паводле балгарскай традыцыі на Вялікдзень таксама фарбуюць яйкі і выкладваюць іх вакол вялікага велікоднага караваю. У балгараў ёсць традыцыя "баёў" велікоднымі яйкамі - два чалавекі, выбраўшы сабе па яечку, бьюць іх адзін аб адзін з аднаго і другога боку датуль, пакуль на адным з іх не з'яўляецца расколіна, пры гэтым "спаборнікі" зычаць адзін аднаму поспеху. Самым удалым

прызнаецца той, у каго пасля "дуэлі" з усімі прысутнымі за сталом велікоднае яйка застанецца цэлым.

У *Швецыі* Вялікдзень адзначаецца не з такім вялікім разгонам, як Каляды, але ў школах яго пачынаюць святкаваць яшчэ за тыдзень да надыходу. Дзеці і іх настаўнікі ўспамінаюць пра цярністы шлях Езуса, успамінаюць яго смерць і ўваскрашэнне з мёртвых. На свята Швецыя мяняецца: жыхары аздабляюць свае дамы велікоднымі кветнікамі, вытрыманымі ў традыцыйных колерах - жоўтым, зялёным і белым. У сваіх дамах шведы паўсюль ўсталёўваюць жоўтых куранят, упрыгожаных каляровымі пер’ямі. На Вялікдзень ужываюць ежу, падобную той, якой яны аддаюць перавагу на Каляды, але на гэты раз значна больш увагі надаецца цукеркам і іншым ласункам. Велікодныя яйкі ў Швецыі робяць з кардону. У сярэдзіну кожнага такога яйка кладуць па цукерку.

Вялікдню ў *Германіі* папярэднічае Пакутная пятніца. Атрыбутам святочнага стала для многіх немцаў у гэты дзень становіцца рыба. Ніхто ў краіне не працуе ў папярэднія велікоднаму дню пятніцу і суботу. А ў суботні вечар у розных населеных пунктах Германіі ладзяць вялікае вогнішча. Гэта вельмі папулярнае акцыя, яна сімвалізуе канец зімы і згаранне ўсіх дрэнных пачуццяў; такія вогнішчы збіраюць вакол сябе мноства людзей. Раніцай велікоднай нядзелі кожная сям’я ў Германіі збіраецца разам за сняданкам. Бацькі напярэдадні хаваюць кашы з ласункамі, велікоднымі яйкамі і невялікімі падарункамі для дзяцей. Пасля сняданку пачынаецца пошук кошыкаў па ўсім доме, які суправаджаецца ўсеагульным смехам і жартамі. Дзецям кажуць, што кошык прынёс спецыяльна для іх і схаваў зайчык. У другой палове велікоднай нядзелі прынята наносіць візіты сваім сябрам і сваякам, дзе ўсе разам п'юць гарбату.

У *Амерыцы* ў велікодную нядзелю для ўсялякай паважанай сям’і абавязковым з'яўляецца наведванне царквы, дзе праходзіць служба ў славу Езуса Хрыста, паўсталага ў гэты дзень з мёртвых. Царкоўная служба суправаджаецца калектыўным спевам ўсіх прысутных у гонар гэтай падзеі. Традыцыйны амерыканскі велікодны абед складаецца з вяндліны з ананасамі, бульбай і іншымі гароднінай, пладовай салаты. Дзеці таксама атрымліваюць кошыкі ад "велікоднай трускі", у якія складаюць каляровыя велікодныя яйкі і шмат шакаладу і цукерак. Традыцыйнай для Амерыкі з'яўляецца адна велікодная гульня, якая карыстаецца неймавернай папулярнасцю: катанне яек па нахільнай газону. Пераможцам спаборніцтва прызнаецца той, хто далей ўсіх без прыпынку зможа пракаціць сваё фарбаванне яйка. Самае масавае спаборніцтва бывае ў велікодную нядзелю на газоне ля Белага Дома ў Вашынгтоне. Сотні дзяцей прыходзяць сюды са сваімі велікоднымі кошыкамі, напоўненымі яскрава размаляванымі яйкамі і катаюць іх уніз па лужку каля прэзідэнцкага палаца.

Каталікі і пратэстанты ў якасці велікоднага сімвала вылучаюць велікодную труску. Ёсць павер'е, што гэта чароўная труска і нясе, падобна курыцы, рознакаляровыя размаляваныя яйкі: хто паводзіў сябе лепш за ўсіх, таму яна падорыць больш яек. Калі на Каляды дзяўчаткі і хлопчыкі вывешвалі над камінам чаравічкі і панчохі, каб раніцай знайсці ў іх падарункі, клапатліва ўкладзеныя Санта-Клаўсам, то на Вялікдзень у зацішных кутках дамоў і свірнаў

выкладваліся каптурыкі і чэпчыкі - лепшага гнязда для велікоднай трускі не знойдзеш, туды яна і адкладае свае чароўныя, пацешныя яечкі.

### *Падарункі на Вялікдзень*

Існуе вельмі прыгожае паданне, якое тлумачыць, адкуль пайшла традыцыя вітацца на Вялікдзень асаблівым прывітаннем - фарбаваць яйкі і дарыць іх адзін аднаму. У часы рымскага валадарства людзі, якія прыходзілі да імператара з просьбай, абавязкова павінны былі прынесці з сабой што-небудзь у падарунак. Багатыя неслі золата, а беднякі - што было ў гаспадарцы. І вось вестка пра ўваскрасенне Езуса Хрыста імператару Тыберыю выпрашыла данесці Марыя Магдалена. У падарунак яна не магла прынесці нічога, акрамя белага яйка. "Хрыстос уваскрос!" - усклікнула яна, паведамляючы імператару навіну, і працягнула свой падарунак. Тыберый пагардліва адказаў, што ў такое несусветнае глупства, як ўваскрашэнне Езуса, ён паверыць, калі толькі вось гэтае белае яйка абавязкова стане чырвоным. І адбыўся цуд! Проста ў руках імператара белае яйка стала ярка-пунсовага колеру. Тады, узрушаны ўладар усклікнуў: "Сапраўды ўваскрос!" Адсюль і пайшоў вядомы нам звычай вітання на Вялікдзень.

Вялікдзень – самае  вялікае свята для хрысціянаў. Уваскрашэнне Хрыста сімвалізуе абуджэнне і прыроды, і пачуццяў: усё уваскрасае і адраджаецца да жыцця.

### *Велікодны стол*

У даўнія часы заможныя гаспадары на Вялікдзень падавалі 48 розных страў, па колькасці дзён мінулага паста. Здобныя кулічы і тварожныя пасхі заўсёды ўпрыгожвалі самаробнымі кветкамі, што сімвалізавалі абуджэнне прыроды і росквіт духоўнасці. Выраб кветак для свята, як і размалёўванне яек, было надзвычай займальным заняткам. І дарослыя, і дзеці выразалі кветачкі і галінкі з каляровай паперы і аздаблялі імі стол, дом, абразы і мэблю.

Абрадавыя велікодныя стравы заўсёды звязвалі з рытуальнай сімволікай ўраджаю. Рэшткі асвячоных ў царкве пірагоў, яек і іншых страў нельга было выкідаць, іх закопвалі на палетку, каб глеба была урадлівай і дала шмат ўраджаю ў бягучым годзе. Адно велікоднае яйка абавязкова захоўвалі да пачатку сяўбы, яго бралі з сабой, калі ішлі сеяць першы раз і з'ядалі на полетку, каб ураджай быў багатым.

Велікодны стол заўсёды быў разнастайным. На яго выстаўлялі закускі з гародніны, тушаныя курыныя трыбухі, селядзец, халадзец, смажаніну з сушанымі грыбамі, качку ці гуся ў мёдзе.

Адной з традыцыйных велікодных страў з'яўляецца куліч. У памяць аб тым, што Ісус Хрыстос пасля ўваскрашэння прыходзіў да сваіх вучням і спажываў з імі ежу, апосталы падчас трапезы не сядзелі пасярэдзіне, дзе звычайна сядзеў Хрыстос, а клалі лусту хлеба, быццам збаўца знаходзіўся сярод іх. Так склаўся звычай пакідаць у Вялікдзень у храме хлеб. На хлебе звычайна

адлюстроўваўся крыж з цярновым вянком, але не было самога ўкрыжаванага, што сімвалізавала перамогу над смерцю.

На велікодны стол, акрамя пасхі, куліча і яек, абавязкова ставілі фігурку баранчыка з цеста. Гэта знак, які нагадвае аб ахвярнай смерці Хрыста дзеля адкуплення грахоў чалавечых.

Яшчэ адна святочная страва – пасха, тварог са смятанай, выкладзены ў выглядзе ўсечанай пірамідкі, сімвалізуе гару Галгофу. Таксама пасха з'яўляецца сімвалам Труны Гасподняй.

Вялікдзень - свята уваскрашэння, адраджэння, таму на стол прынята ставіць прарослае збожжа (пшанічнае, ячменнае або іншае). Кволыя парасткі, якія выйшлі з сухога насення, сімвалізуюць паміранне і вяртанне да жыцця.

## Сцэнарый Свята бярозкі
## "БЯРОЗАНЬКА БЕЛАЯ"

***Мэта:*** *Выхоўваць павагу і любоў да традыцый і звычаяў нашых продкаў, да гісторыі нашага краю; запаліць у сэрцах агонь памяці, духоўнасці, якая закладзена ў старажытных песнях і танцах, гульнях і абрадах.*

***Літаратура:***

1. Беларускі фальклор: хрэстаматыя / склад. К.П. Кабашнікаў [і інш.]. – Мінск: Выш. шк., 1977.
2. Коваль У.І., Новак В.С, Беларускія народныя святы і звычаі. — Гомель, 1993

***Афармленне:*** *Свята праводзіцца на адкрытай пляцоўцы. Тэрыторыя ўпрыгожана зелянінай, бярозкамі. З аднаго боку пляцоўкі ўстанаўліваецца стол, на ім рассцілаецца абрус і расстаўляецца посуд. З другога боку — на дзвюх стойках замацоўваюцца бярозавыя галінкі, стойкі нахіляюцца адна да адной і звязваюцца стужкамі. Бярозкі, якія растуць ў панадворку святочна прыбраны рознакаляровымі стужкамі.*

***Ход свята***

1 **вядучы.** Добры дзень, паважаныя госці!

2 **вядучы .** Вітаем вас, людзі добрыя!

1 **вядучы** . Сёння мы сабраліся адзначыць цудоўнае свята - свята бярозкі!

2 **вядучы.** З даўніх часоў бяроза была адным з найбольш шанаваных дрэў ва ўсходніх славян! Нашы продкі садзілі бярозкі каля сваіх сядзіб, таму што верылі, што яны здольныя абараніць чалавечае жытло ад злых духаў і заклікаць усё самае добрае і светлае!



1 **вядучы**. Бярозка валодае каштоўнымі якасцямі: бярозавыя дровы лічацца найлепшымі носьбітамі цяпла; бярозавы сок, багаты вітамінамі і мікраэлементамі , з'яўляецца літаральна "жывой вадой" для стомленнага працяглай

зімой арганізма; кара бярозы ўжываецца для вырабу розных прадметаў гаспадарчага побыту.

2 **вядучы**. Бярозка з'яўляецца сімвалам святкавання ўсяго траецка-сёмушнага цыкла, які мы з вамі нядаўна святкавалі. А як жа святкавалі яго нашы продкі?

1 **вядучы.** Упрыгожвалі свае святыні, хаты, двары, і вуліцы зелянінай, бярозамі, праводзілі абрады : завівання бярозкі, завіванне вянкоў, кумлення, упрыгожвання бярозкі, хаджэння з ёй і патаплення, кідання вянкоў у ваду, і завяршалася ўсё агульнай абрадавай трапезай .

**2 вядучы.** На свята збіраліся ўсе жадаючыя. Жанчыны песні спявалі, дзяўчаты з хлопцамі гулялі, варажылі.

1 **вядучы.** Зараз нашы дзяўчынкі з фальклорнага аб'яднання па інтарэсах крыху падрабязней раскажуць нам пра гэта свята.

**1 -я дзяўчынка.**

Перш за ўсё побач з абрадавым дрэвам выконвалі ахоўныя дзеянні і спявалі песні-заклічкі : згодна з веравызнаннямі нашых продкаў , дрэва магло нашкодзіць таму, хто парушае грамадскія забароны ў дачыненні да раслін. На маладой бярозе згіналі і звязвалі у выглядзе кольца верхавіну або галінкі дрэва; часам у выглядзе аркі звязвалі вяршаліны двух дрэў, якія раслі побач.

**2-я дзяўчынка.**

Адной з самых старажытных форм заключэння саюза з дрэвам было яго "кармленне" , таму на Сёмуху побач з дрэвам заўсёды праводзілі рытуальную трапезу- смажылі яечню або разбівалі яйкі. Саюз з дрэвам вымагаў ўзаемнага пераўвасаблення двух удзельнікаў абрадавага дыялогу, таму моладзь прыбірала бярозку у жаночае адзенне, упрыгожвала стужкамі і хусцінамі. У той жа час дзяўчаты ўпрыгожвалі сябе зелянінай, пераўвасабляючыся ў татэмнае дрэва.

**3 -я дзяўчынка.**

Выконвалі абрад "кумленне" : прысутныя дзяўчаты заключалі паміж сабой сяброўскі саюз, для чаго цалаваліся праз завітыя колцы бяроз і абменьваліся падарункамі. Таксама адбываўся выбар абрадавай бярозкі, якую ссякалі, абходзілі з ёю вакол вёскі, абносілі хаты і ўсталёўвалі на " галоўным" месцы ў вёсцы. А роўна праз тыдзень дзяўчаты зноў ішлі да бярозкі, расплятаті, развязвалі яе галінкі, каб дрэва не пакрыўдзілася і не прынесла бяды.

**1 -я дзяўчынка.**

Зараз нашы сяброўкі пакажуць вам некаторыя моманты абрадаў.

## Абрад "Ваджэнне куста"

*Выходзяць вядучая і гурт дзяўчынак, якія спяваюць песню "Ой, вывяду куст я" і водзяць карагод. У цэнтры яго становіцца дзяўчынка, якая апранута "кустом". Да стала падыходзяць Гаспадар і Гаспадыня. Дзяўчынкі робяць круг па пляцоўцы.*

**Вядучая.** Цераз наша сяло
Дзявочае войска ішло,
А сяльчане не здзівіліся,
Што такія ў нас нарадзіліся.
**1-ы глядач.**
Дай вам Бог,
Нашы дзевачкі,
Што вы ўсе
Прыгожы паненачкі!

*Дзяўчынкі падыходзяць да Гаспадара і Гаспадыні, разам вітаюцца: "Добры дзень у хату!".*



**1 -я дзяўчынка.**
У гэтым двары
Гаспадары харошы,
Не пашкадуюць
Нашаму кусту грошай!
**2-я дзяўчынка.**
Мы звілі куста
З зялёнага клёну,
Ой, выйдзіце, пане,
Ды з новага дому!
**Гаспадар.**
Госці прыехалі
Да нас на залатым кані,
У зялёным саф'яне!
**Гаспадыня.**
Міласці просім,
Дарагія госці!

*Дзяўчынкі спяваюць песню "Пава ляцела", ухваляючы гаспадароў хаты.*

**3-я дзяўчынка.**
Прыйшлі мы да вас з паклончыкам,
А выйсці павінны з гасцінчыкам!
Воўк кожны год ліняе, а звычаю не мяняе!

**Гаспадыня.**
Даём вам, госці, пірог,
Каб ён вам сілу збярог!
**Гаспадар.**
"Куста" ваша малада і хароша.
За яе вам дадуць яшчэ й грошай!
**4-я дзяўчынка.**
Яна молада і весела.
Яе вадзіць па сялу будзем да вечара!
**5-я дзяўчынка.**
Дзякуй за ўсё.
Няхай вясёлым будзе
Ваша жыццё!
Няхай багата
Будзе ежа і піццё!
**Гаспадар.**
За добрыя словы
Вазьміце яшчэ квас.
**Гаспадыня.**
І на другі год
Прыходзьце да нас!

*Дзяўчынкі спяваюць песню "Ой, вывяду куст я" і ідуць у адзін бок пляцоўкі, Гаспадар і Гаспадыня — у другі.*
*Дзяўчынкі пад музыку ідуць праз арку да бярозы і пачынаюць абрад “Завіванне бярозкі”.*

**1 -я дзяўчынка.**
Бярэзінка белая, бярэзінка кучаравая,
На чым прыехала?

**Бярозка.**
На дыване, на золаце,
На атласе, на аксаміце.
**2-я дзяўчынка.**
У каго ж ты гасцявала?
**Бярозка.**
У бацькі, у маці,
У роду, у племя,
У прыгожых дзяўчат!
**3 -я дзяўчынка.**
Бярэзінка кучаравая, кучаравая, малажавая,
Пад табой , бярэзінка, не агонь гарыць,
прыгожыя дзяўчаты ў карагодзе танцуюць.

*Танец – карагод “ У полі бярозка стаяла”*



**1 -я дзяўчынка.**
Пойдзем, пойдзем дзевачкі,
Ва лужочкі, завіваць вяночкі.
На ячмень каласісты,
На авес расісты,
На грэчку чорную,
На капусту белую!

**2-я дзяўчынка.**
Узрадуйся, бела бярозка!
Да цябе ідуць дзеукі красныя!
Табе нясуць яечню смачную,
Табе пяюць песні звонкія.

*Дзяўчынкі становяцца па парах так, каб у пары апынулася адна дзяўчынка з вянком, танцуюць і спяваюць песню "Пойдзем лугам".*

**1 -я дзяўчынка.**
Мой вянок, мой зялёны вяночак,
Вяночак, пунсовая кветачка
Ды каму ж я свой вяночак падару?
**2-я дзяўчынка.**
А я загадаю свой вянок на сябра, мілага Аляксея
Хай не завяне вянок мой на бярозцы, а калі ў воду яго кіну,
Хай не прыб’е яго да берага,
у наступным годзе значыць замуж за яго пайду!
**3 -я дзяўчынка.**
А я загадаю свой вянок на бацечку і матулечку. Хай не завяне
Мой вянок, а бацькі мае хай здаровымі будуць.
**4-я дзяўчынка.**
А што ж, сяброўкі, зязюля маўчыць? Зязюля, зязюля, колькі мне гадоў у дзявоцтве хадзіць
(зязюля кукуе тры разы)
- Дзякуй, зязюлечка, і то добра, пасаг яшчэ не гатовы.
**1 -я дзяўчынка.**
Вось мы бярозку белую завілі
Ужо мы вяночак – за бацечку,
Ужо другі – за матушку,
А трэці вянок – за саму сябе!

*(вешаюць вянкі на бярозку)*

**1 -я дзяўчынка.**
Калі ты, мая доля, шчаслівая,
**2 -я дзяўчынка.**
Калі ж ты, мая доля, няшчасная,
Сохні, вяночак, як сухарочак.
**3 -я дзяўчынка.**
Няхай вянкі вісяць, не засыхаюць,
Ды нас дажыдаюць!
**Бярозка.**
Кумушкі – галубушкі, не сварыцеся,
Памірыцеся. А памірыўшыся, пакуміцеся!

**1 -я дзяўчынка.**
Праз бярозавы вянок – пакумімся, сяброўкамі станем,
Пакумімся, кума, пакумімся,
Каб нам с табой не лаяцца,
Вечна сябравацца.
*(цалуюцца праз бярозавы вянок)*

**2 -я дзяўчынка.**
А табе, бярозка, падрасці, ды пабольшаць.
Ды налецце касу табе расплесці,
Каб сваты і сваццi не выходзілі з хаты,
Каб не сядзець табе ў хаце.
Мо заспяваем, кумачкі?

*"Кума, мая кумачка" - беларуская народная песня*

1 **вядучы .**
Якая прыгожая, якая непаўторная маладосць!Параўнаць яе можна толькі з веснавой зелянінай, з пяшчотнымі першымі кветкамі…
2 **вядучы.**
У міфапаэтычнай спадчыне беларусаў і іншых славянскіх народаў бяроза заняла пачэснае месца – яна стала сімвалам веснавога абуджэння прыроды, цнатлівасці, сарамлівасці і, адпаведна, урадлівасці і дабрабыту.
1 **вядучы .**
У час сватаўства дзяўчыну параўноўвалі з бярозкай, а хлопца - з дубам. У вясельных песнях замужнюю жанчыну таксама называлі бярозкай: " Учора краснай калінай была, а сёння белай бярозкай стала".
**Чытальнік :**
Завушніцы надзела бярозка,
Лёгкім шалікам стан абвіла,
Стаіць сціпла на ўскрайку гасцінца,
З хваляваннем чакае дубка.

Тут павінна адбыцца сустрэча –
І не будзе бярозка адна.
Час у думках хутчэй падганяе,
Мары здзейсніцца просіць яна.
Але не даехаў той любы, адзіны:
Рабіну сустрэў на дарозе сваёй…
Сумуе бярозка, душа зашчамляе:
Няўжо ёй адвеку застацца адной?
Не сумуй, не шкадуй ты аб здрадзе,
Прыйдзе шчасце яшчэ у лёс твой:
За ялінай густой верны клёнік
Назірае даўно за табой.

Т.Самошкіна

*(Выходзіць жанчына ў квяцістай хустцы – народны лекар пані Беразоўская )*

**Пані Беразоўская** : Добры дзень, мае дарагія , мае залатыя! Ну як вы тут? Як здароўе? Не падводзіць? Ой , бачу, бачу, не ўсё ў вас у парадку! Чуе мая душа, дапамагаць вам трэба тэрмінова і рашуча !

Буду вас лячыць ! Чым? Бярозай!

Бяроза - гэта такое дрэва, якое сваімі каранямі звязана з мінулым чалавечага роду, а яе вяршаліна “ чытае “ інфармацыю нябёсаў і праз сваё убранства дае сімвалічныя звесткі аб стане надвор’я на даволі аддаленую перспектыву, г. зн. прадказвае будучыню!

Вось, напрыклад : калі на пачатку кастрычніка не ўся лістота абсыпалася з бярозы, то снег ляжа позна; а калі да Пакроваў цалкам ападзе лістота з дуба і бярозы, то год будзе лёгкі, калі ж не, то зіма будзе цяжкай.

А вось як лечыць бяроза, зараз убачыце самі, усё самі адчуеце, усё самі пакаштуеце!

У каго з прысутных павышаны ціск? Зараз будзем здымаць!

Вось такую “шайбу”, выразаную з асіны прыкладаем да патыліцы, дзяржым 10 хвілін ( яна забярэ на сябе адмоўны энергетычны зарад), а затым на 15 хвілін на калені, або спіну пакласці вось такую бярозавую дошчачку, якая “напоўніць” вас жыццядайнай энергіяй беластволай прыгажуні.

А можна проста, мае даражэнькія, прыйсці ў парк, ці на ўскраіну леса, выбраць прыгожую бярозку, прытуліцца да яе спінай і расслабіцца. Праз 15-20 хвілін вы адчуеце, як ваша цела напоўніцца сілай, а ўся стомленнасць “сцячэ” на зямлю. Не забудзьцеся толькі “падзякаваць” дрэву за спачуванне і аказанную дапамогу.

У народнай медыцыне даволі шырока выкарыстоўваўся бярозавы сок. Ім лячылі ліхаманку, сухоты, яго прымянялі для прымочак пры вонкавых язвах, паілі дзяцей у перыяд прарэзвання зубоў. Пра тое ёсць на Беларусі прыказка : ***“Свяжынка ў раток, здароўя ў жыватoк,***

***прыткасць зайца, моц мядзведзя, лоўкасць ваўка".*** Дзяўчаткі, дапамажыце, калі ласка, пачастуйце ўсіх сокам бярозавым, бо сок гэты на жывую ваду вельмі падобны.

Гэта прыказка, а зараз будуць загадкі. Хто адгадае, таму - падарунак ад бярозкі для нашага здароўя!

(загадвае загадкі. Таму, хто адгадае, у падарунак - бярозавы венік)

Нашы продкі лічылі, што калі пасадзіць маладзенькую бярозку у гонар нараджэння дзіцяці, то яго абмінуць усе беды, а нястачы абыйдуць хату бокам.

А які ж добры сродак для выхавання дзяцей! Сама правярала!

**Чытальнік :**

Не хачу нават думаць, што плачуць бярозы.
Гэта промень вясновы і моц ад радзімы маёй –
П'ю чароўную вільгаць, чысцюткі нектар, нібы росы,
Каб не здрадзіла памяць і шляхі каб дадому вялі…
Ўсю збалелую душу, дзе зімою прайшліся марозы,
Адзінота скавала – не дажыць да вясны…
Мне надзею дае, падмацоўвае веру бяроза
І цяпло, што прынеслі на крылах з вандровак буслы.

В.Шышко







# II. Выкарыстанне этнакультурных элементаў пры правядзенні масавых мерапрыемстваў

Масавыя мерапрыемствы – гэта невялічкія дзверы ў вялікі свет дзіцячага пазнання, у якім дарослыя – настаўнікі і сябры для навучэнцаў. І крупінка гэтага вялікага працэсу – у далучэнні навучэнцаў да этнакультурных традыцый. Выхаваўчая работа, пабудаваная на матэрыялах народнай педагогікі, уключае падрыхтоўку і правядзенне мерапрыемстваў, звязаных са звычаямі і абрадамі сямейнага жыцця, побытам беларусаў, з мастацка-эстэтычнай дзейнасцю ў розных жанрах і відах матэрыяльнай і духоўнай творчасці. Сама назва – масавыя гаворыць аб тым, што іх задачай з’яўляецца ахапіць як мага больш дзяцей і падлеткаў. Таму гэта работа павінна мець цікавыя формы: літаратурныя гасціныя, сустрэчы і вечары, выставы і экспазіцыі, экскурсіі і канферэнцыі і інш.

Прыкладам падобных мерапрыемтсваў могуць быць: Беларускі кірмаш, Свята народнай цацкі, выставы, конкурсы нацыянальнай мастацкай творчасці і інш.

Накірункі выхаваўчай дзейнасці:

- арганізацыя і правядзенне сумесных з бацькамі музычных і літаратурна-мастацкіх фестываляў, свят, конкурсаў, спектакляў ранішнікаў;
- арганізацыя і правядзенне ярмарак, аукцыёнаў вырабаў і г.д.;
- арганізацыя і правядзенне тэматычных мерапрыемстваў: гутарак, дыскусій, дыспутаў;
- арганізацыя і правядзенне сустрэч з вядомымі людзьмі творчых прафесій;
- арганізацыя і правядзенне экскурсій, паходаў, паездак па гісторыка-культурных цэнтрах;
- наведванне тэатраў, кінатэатраў, музеяў, выстаў;
- правядзенне конкурсаў творчых работ вучняў, прысвечаных святочным датам.

# Сцэнарый свята нацыянальнай кухні

***Мэта:*** *Выхоўваць павагу і любоў да традыцый і звычаяў нашых продкаў, да гісторыі беларускай кухні, зацікавіць прыгатаваннем спрадвечна беларускіх страў.*

***Эпіграф:“А на стале тым – рай ды годзе”***

***Літаратура:***
**1.**”Беларуская кухня”, Мн. “Ураджай” 1993.
2.”Літоўская гаспадынька”, Мн. “Полымя” 1993.
3.”Новая зямля”, Я.Колас.
4.”Родныя дзеці”, Н.Гілевіч
5.”Пачаткі роднае мовы”, В.Раманцэвіч.

***Афармленне:*** зала нагадвае беларускую карчму. Сцены ўпрыгожаныя каляровымі плакатамі, намаляваныя ў нацыянальным стылі. На іх прыказкі і прымаўкі:

*Усё зашкодзіць, што занадта, нават пірагі.*
*Запас бяды не чыніць.*
*Смачна было, ды блізка дно.*
*На смачны кусочак знойдзецца раточак.*
*Калі на стале гусь і парася, то работа хараша.*
*Калі хлеб у возе, то няма бяды ў дарозе.*
*Без хлеба яда—да парога хада.*
*Чалавек галодны ні на што не годны.*

Столікі ссунутыя па два, накрытыя вышыванымі абрусамі. Ручнікі прымацаваныя і на сценах. На сталах – нацыянальныя стравы. Гучыць беларуская музыка.

***Ход свята***

*Усе ўдзельнікі сядзяць за столікамі па 5-6 чалавек. Усе выконваюць песню “Сёння ў нашай хаце свята”(або гучыць яна ў запісе).*

***Вядучы:*** Сёння ў нашай хаце сапраўды свята. Яго мы прысвяцілі нацыянальнай кухні, якую ведаем вельмі і вельмі мала. Якія стравы спажывалі нашы продкі? Як яны называліся і як гатаваліся? У якіх абрадах іх ужывалі беларусы? Якое

значэнне яны мелі і маюць? Пра ўсё гэта нам і раскажуць сёння ўдзельнікі свята.
***Вядучы:*** Давайце паслухаем гісторыю нашай нацыянальнай кухні. (*Удзельнікі па адным ад століка распавядаюць)*

***З гісторыі нацыянальнай кухні:***

1. Шматвяковую багатую і цікавую гісторыю мае беларуская кухня. Спрадвеку беларусы падтрымлівалі цесныя сувязі з рускімі, украінцамі, палякамі, літоўцамі і латышамі. І заканамерна, што беларуская кухня зрабіла ўплыў на кухні гэтых народаў. І наадварот. Пра гэта сведчаць і агульныя назвы адных і тых жа страў, кулінарных вырабаў і напояў, розных кухонных рэчаў і посуду. Вядома, напрыклад, што літоўцы і латышы перанялі беларускае слова талакно, а беларусы — літоўскае слова луста. Крупнік мае агульную назву ў палякаў, літоўцаў. А традыцыйная страва беларусаў верашчака папулярная і ў Латвіі. Добра вядомая беларуская зацірка ў рускай, літоўскай, польскай і ўкраінскай кухнях.

2. Беларусы, як і іншыя славянскія народы, здаўна займаліся земляробствам. Жыта, пшаніца, ячмень, авёс, грэчка, гарох — найстаражытнейшыя культуры на Беларусі. У паўсядзённым харчаванні беларусаў выкарыстоўваліся збожавыя і гародніна, што вырошчваліся і вырошчваюцца на палях і агародах. Печаны жытні і іншыя вырабы з жытняй мукі на працягу многіх стагоддзяў панавалі ў харчаванні насельніцтва. У беларусаў з дзяцінства выхоўваліся да хлеба павага і беражлівасць. З ім ішлі на радзіны, у сваты, на вяселле і іншыя ўрачыстасці. Хлебам-соллю сустракалі дарагіх гасцей. Самы старажытны хлебны выраб у славян — каравай. У беларусаў каравай і ў нашы дні з’яўляецца абавязковым на вяселлі. Звычайна ён мае круглую форму, зверху ўпрыгожваецца фігуркамі птушак, жывёл, чалавечкаў з цеста. Падаецца каравай на вяселлі напрыканцы ўрачыстай трапезы як сімвал матэрыяльнага дастатку.

3. У 20-30-я гады былі распаўсюджаны такія стравы, як талакно, жур (аўсяны кісель), крупнік, пячона (каша з пшана), калатуха, поліўка, верашчака (мясная страва). З жытнімі і бульбянымі блінамі часта ўжывалі тоўчанае семя льну і каноплі, шкваркі, гурочны і капусны расол. Шырокае распаўсюджанае ў беларускай кулінарыі да 50-х гадоў XX стагоддзя мелі замяняльнікі хлеба: сачні, драчоны, скавароднікі. Іх рыхтавалі таксама з жытняй, ячменнай і зрэдку пшанічнай мукі. Скавароднікі пяклі з кіслага цеста. Сачні рабілі больш тонкія, чым скавароднікі, але таўсцейшыя за бліны. Для прыгатавання сачней (тоўстых мучных бліноў) часта выкарыстоўвалі начынку: бульбу, яблыкі, вішні, слівы і інш. Для драчон бралі сыроватку або свежае малако, а таксама хлебны, кляновы або бярозавы квас. Цеста рабілі больш вадкім, чым для выпечкі хлеба.З лепшых гатункаў мукі пяклі хрусты, каржаны, пернікі, з квашанага цеста рабілі пірагі (з грыбамі, яйкамі, ягадамі).

4. З мучных страў найбольш папулярнымі былі клёцкі, зацірка, кулеш, лапша, налісьнікі, ламанцы, з крупяных — крупнік, панчак, гушча. Іх падавалі з мясам, смажаным салам, малаком, маслам. Асабліва разнастайныя ў Беларусі стравы з бульбы, якую да сённяшняга часу называюць другім хлебам. Бульбяная бабка, камы, дранікі, калдуны, капытка, поліўка, тушанка.

У старабеларускіх крыніцах часта ўзгадваюцца розныя расліны, якія выкарыстоўваліся ў якасці прыправаў: пастарнак, мята, пятрушка, кмен, кроп, хрэн, мак. Многія лічаць, што беларусы да X стагоддзя былі вегетарыянцамі. Але гэта не так. Здаўна найбольш распаўсюджаным было свіное мяса. На сялянскім стале кілбасы, вяндліна і іншыя прадукты з мяса з'яўляліся ў святы і падчас сямейных урачыстасцей. У паўсядзённым харчаванні мяса служыла толькі “прыправай” да крупяных страў і гародніны. З мясных страў рыхтаалі ў сёлах пячысты, вантрабянку, студзяніну, паляндвіцу, кілбасу сялянскую.

5. З глыбокай старажытнасці каровіна малако, тварожны сыр з'яўляліся ўлюбёнай стравай славянскіх народаў. Масла і смятану падавалі да аладак, дранікаў, бабкі. З тварагу рабілі сыр, сырніцу.

У вялікай пашане ў беларусаў былі грыбы — свежыя, сушаныя, салёныя, марынаваныя, а таксама лясныя ягады — чарніцы, дурніцы, суніцы, брусніцы, маліны, журавіны .Садавіну і ягады сушылі, мачылі, з іх гатавалі разнастайныя напоі -- бярозавік, мядуху, кляновік, збіцень. Сярод вегетарыянскіх страў найбольш распаўсюджанымі былі кулага з чарніц або дурніц з дамешкам пшанічнай мукі і цукру, саладуха — каша з жытняй або пшанічнай мукі і соладу. Здаўна славянскія народы рыхтавалі напоі з мёду. У паўсядзённым жыцці ўсе саслоўі ўжывалі квас. Яго рыхтавалі з хлеба жытняга, жытняй, ячменнай, аўсянай мукі і соладу.

6. Вельмі многія звычаі, асабліва да 1917 года, былі звязаныя з прыгатаваннем спецыяльных абрадавых кулінарных вырабаў, страў і напояў. Сярод шматлікіх абрадаў. Самы багаты канечне ж вясельны стол. А сярод сямейных урачыстасцей, прысвечаных рэлігійным святам, вылучаліся Каляды і Вялікдзень. Стол тады ў кожнай сям'і быў вельмі багаты і адрозніваўся ад паўсядзённага. Цікава нагадаць пра застольныя традыцыі, якія існавалі з даўніх часоў. У кожнай сям'і прытрымваліся не толькі адпаведнага рэжыму ў хатнім харчаванні, але і пэўнага адпрацаванага этыкету. Малодшыя члены сям'і ніколі не садзіліся за абедзенны стол раней за старэйшых. Падчас ежы ніколі не чуваць было прыхлёбванняў, прычмокванняў. Гутарак за сталом таксама не вялі.



***Вядучы:*** Праслухаўшы гісторыю нацыянальнай кухні, мы нешта задумаліся, аб нечым і крыху засумавалі. Сёння ў нас жа свята. А якое свята праходзіць без конкурсаў, песняў ды скокаў. Вось мы і абвяшчаем конкурс на найлепшую частушку аб стравах.У

вас на століках стаяць пустыя місы. Але за кожны конкурс яны могуць напаўняцца вось такімі пернікамі. У якой каманды будзе найбольш пернікаў, тая і пераможа.

*Навучэнцы ад кожнай каманды па чарзе выконваюць прыпеўкі. Журы ацэньвае конкурс .*

***Вядучы:*** Вы ўсе, мабыць, заўважылі, як прыгожа ўбраныя сёння сталы, яны ломяцца ад розных страў. І мы абвяшчаем конкурс на найлепшую сервіроўку стала. (*Журы ацэньвае конкурс*).



***Вядучы:*** Ну а цяпер я аб'яўляю наступны конкурс. Гэта дамашняе заданне — рэклама стравы беларускай нацыянальнай стравы. Кожная група прыгатавала страву. А вось якую? Яны распавядуць самі.

*Кожная група па чарзе рэкламуе сваю страву.*
*Музычная паўза. Выконваецца беларуская песня.*
*Пасля журы разам ацэньвае конкурс.*

***Вядучы:*** У беларускай літаратуры шмат ёсць, твораў-прысвячэнняў нацыянальным стравам.

Раман у вершах “Родныя дзеці” — адзін з іх. І мы пачынаем эстафету выразнага чытання -- урыўка з гэтага рамана.

***Вядучы:*** Вось ты ў гасцях — і нават слоўца
Табе сказаць няма калі:
Вяндлінку з водарам ядлоўца
Мяцеш—зараз па два скрылі!
*Далей працягваюць чытаць вучні з кожнага століка па чарзе.*

1. А побач зірк! — як цуд, як казка—
З каляндрай, перцам, часнаком-
Ляжыць вясковая каўбаска,
Таксама ўвітая дымком!
К таму ж падсохла на гарышчы —
Дык толькі плеўка шапаціць!
Умэнт кальцо з паўметра знішчыў—
Адно раз'ятрыў апетыт!

2. Калі ж дапаў да вантрабянкі--
Цягаць стамілася рука!
Глядзіш — а ўжо кіндзюк крывянкі
На блюда выклалі з гаршка!
О,гэны зверху і сысподу
Наскрозь усмажаны каўтух!
За чатырох змалоў — уходаў!
(Хоць сам ты лічыш, што за двух)

3. Паспеў адчуць, што ўжо не слабка

І ў паясніцы,-- а на стол
Тым часам едзе ў місе бабка
І парай дыхае пад столь.
З бакоў запечаная ўмеру,
У бульбе скварачкі тырчаць...
І так жа ўслед пайшла на змену —
Хоць замычы — каб не маўчаць!

4.“Усё!—сказаў.—На гэтым дзякуй!”
А на абрус -- нясуць бліны
Да іх — мачанку-верашчаку
З наборам рэбрачак свіных!
Хвіліну выстагнаў ты моўчкі:
“Дзе месца ўзяць? Патоўпіць дзе?”
І неўпрыкмет на два-тры вочкі
Паслабіў пас на жываце.

5. Ужо не здыхацца! Падпёрла—
Няйначай крушня камянёў!..
А перад носам ... ставяць цёрла
Гарачых, тлустых калдуноў!
Калдун!.. Духмяны, самавіты,
У масле ўсмяглы, а паўзверх —
Смятанкай свежаю паліты!..
Ну што? І зноў глядзіш, як звер?

6. І адчуваеш, адчуваеш:
Няхай хоць з гэтуль у труну-
А не зганьбуеш, не стрываеш—
Дасі прытул і калдуну!
Дасі!.І добра зробіш, браце!
І не ўпікай дарма сябе!
Ты за ядой — як і на працы:
На малацьбе ці на касьбе!

***Вядучы:*** Калі на свеце нехта дзесьці
Умее добра працаваць,--
То ўмее ён і смачна з’есці
І – адпаведна—згатаваць!
Таму — дастойна, без эфекту
Прымай падзяку-пахвалу—
І беларускаму таленту,
І беларускаму сталу!
І цмокні ў ручку гаспадыні,
Каб сонцам пырснула яна,
І ўскінь яшчэ—а то астыне!—
Ускінь на сэрца... калдуна!..

***Вядучы:*** А вось і калдуны. І пакуль нашы госці будуць частавацца калдунамі, мы аб’яўляем конкурс на лепшую назву гэтай беларускай нацыянальнай стравы. Гэта можа быць прыказка, прымаўка, радок з верша, вядомая фраза або проста прыдуманае вамі выказванне, якое, на ваш погляд, найлепш падыходзіць да гэтай стравы.

*Пасля журы абвяшчае, чыя ж назва была найбольш арыгінальнай. Тая каманда атрымоўвае чарговы пернік у місу.*

***Вядучы:*** А цяпер такіх пернікаў ёсць магчымасць зарабіць больш, бо мы аб’яўляем конкурс ”Працягні прыказку”. За кожную правільна названую прыказку — пернік. Адказвае той, хто першы падыме сцяжок.
*Вядучы называе пачатак прыказкі, навучэнцы—працяг.*

- Гаспадарку весці — (не кашу есці)
- Хто не дбае, (той нічога не мае)
- Запас (есці не просіць)

- Без запасу чалавек (гіне без часу)
- Няхай ляжыць, (хлеба не просіць)
- У дзіравым вядры (не носяць вады)
- Не печ корміць, (а рукі)
- Дзе цвет, (там і мёд)
- Горка рэдзька (ды ядуць)



***Вядучы:*** Веданне фальклору — адзін з паказчыкаў культуры чалавека. Сёння ў нас гучалі частушкі, прыказкі і прымаўкі. А вось наколькі мы кемлівыя, пакажа нам веданне беларускіх загадак. За кожную правільна разгаданую загадку -- пернік. Будзьце ўважлівымі.

*Вядучы загадвае загадкі, навучэнцы разгадваюць:*
- Вадкае, а не вада, белае, а не снег. (Малако)
- Што ў вадзе родзіцца і ў вадзе расходзіцца? (Соль)
- Чорненькае, маленькае ў караля на абедзе (Перац)
- Белы, як снег, салодкі, як мёд (Цукар)
- Скажы мне , цяцера, што з цябе робіць звера? (Гарэлка)
- Без чаго найбяднейшы чалавек вячэраць не сядзе (Без лыжкі)
- Не разаб'еш гаршчок, не з'ясі і кашы (Арэх)
- Чорны колер, вінны смак, каменнае сэрца (Вішня)
- Усіх нас корміць, а сама есці не просіць (Зямля)

*Журы падводзіць вынікі конкурсаў, у якой каманды аказалася найбольш пернікаў, тая і перамагла. Каманду-пераможцу вядучы віншуе пірагом і запрашае ўсіх да пачастунку. Удзельнікі свята дзеляцца рэцэптамі страў.*

***Вядучы:*** Вось і заканваецца наша свята. Вельмі хочацца, каб вам, дарагія дзеці, вам, паважаныя госці, штосьці запомнілася, каб вы пакарысталіся нашымі рэцэптамі. На развітанне пажадаем, каб сталы ў нашых хатах былі багатымі, а душы і сэрцы—добрымі і шчодрымі.
*Ад кожнага століка удзельнікі свята па чарзе гавораць зычанні.*
- Каб доўгія гады жылі, здаровыя былі і на нас не забываліся
- Няхай будзе так, як добрыя людзі кажуць
- Каб жылося, былося, елася  і яшчэ больш хацелася
- Будзь вясёлы, як сват на вяселлі, здаровы, як вада, багаты, як зямля
- На доўгі век, на добрае здароўе
- Я зычу вам таго, чаго і сабе жадаю.

*Гучыць песня "Сёння ў нашай хаце свята". Спяваюць усе разам.*

## Змест свята “Чароўны куфэрак”

**Задачы:** дапамагаць дзецям у спасціжэнні светапогляду і душы народа, яго гумару, таленавітасці і майстэрства; выхоўваць патрыятызм.

**Падрыхтоўчая работа.** Удзельнікі дзеляцца на творчыя мікракалектывы. Кожнаму з іх даручаецца даследаваць выслоўі, скорагаворкі, загадкі жарты, забаўлянкі, прымаўкі і прыказкі, загадкі і г. д.

### Першы этап. "Легенды і паданні".

**Вядучы.** Увага! Знойдзены чароўны куфэрак! У куфэрку забытыя паданні, казкі, розныя пацешкі, забаўлянкі, народныя гульні, жарты і г. д. Ці адкрываць куфэрак?
**Навучэнец.** Адкрываць!
**Вядучы.** А з чаго пачынаць?
**Навучэнец.** З легенд і паданняў!
*Даецца слова мікракалектыву, які рыхтаваў легенды і паданні. Дзеці ўзгадваюць адну-дзве легенды пра паходжанне бусла, зязюлькі; расказваюць, адкуль пайшлі беларусы і інш.*

### Другі этап. "Жарты, анекдоты, гумарэскі".

**Вядучы.** Беларусь! — народ кемлівы, таленавіты, які любіць і цэніць гумар. Не верыце? Слухайце.
*Даецца слова мікракалектыву, які знаёміць дзяцей з сабранымі гумарэскам і і жартамі. Напрыклад:*

**Залаты век**
— Калі быў залаты век?
— Тады, калі людзі не ведалі золата.
**Дзіва**
— Гэта дзіва, як тыя вучоныя ўсё ведаюць, нават зацьменне сонца могуць прадказаць.
— Вось дзіва! Гэтак і я патраплю, бо пра зацьменні з кожнага календара можна даведацца.
**Яшчэ не выпілі**
Маці. Ты змяніла ваду рыбкам у акварыуме?
Дачка. Не, яны яшчэ не выпілі тую, што я ім учора наліла.

## Трэці этап. "Скорагаворкі".

*Праводзіцца конкурс "Лепшы гаварун", удзельнікі якога чытаюць скорагаворкі тыпу:*

Пекар Пётр пёк пірагі.
Ткач тчэ тканіну на хустку Антаніне.
Не любіла Міла мыла, мама Мілу мыла мылам.
Ехаў грэка цераз рэку, бачыць грэка — ў рацэ рак,
ўсунуў грэка руку ў рэку, рак за руку грэку — цап!

**Вядучы.** Да скорагаворак блізкія выслоўі. Нагадайце, калі ласка, іх нам!

Аднак жа, як свінню ні кліч,
Яе заўсёды выдасць лыч.
(К. Крапіва.)

Не можаш памагчы, дык лепей памаўчы.

## Чацвёрты этап. "Забаўлянкі".

*Навучэнцы знаёмяць прысутных з забаўлянкамі, якія сабралі. Напрыклад:*



Ішоў бай па сцяне
У чырвоным каптане.
Нёс ён торбу на спіне.
Што у торбе, тое мне.

Кую, кую ножку,
Паедзем ў дарожку,
Дарожка крывая,
Кабылка сляпая
Зачапілася за пень,
Прастаяла цэлы дзень. І інш.

## Пяты этап. "Загадкі жарты".



*Мікракалектыў знаёміць з загадкамі жартамі, запрашае прысутных прыняць удзел у іх адгадванні:*

На якое пытанне нельга даць сцвярджальны адказ? (Ты спіш?)
Сын майго бацькі, але мне не брат. (Ты сам.)
Што знаходзіцца пасярэдзіне Волгі? (Літара"л".)
У бацькі тры сыны. А ў кожнага сына — сястра.

Колькі ў бацькі дзяцей? (Чацвёра.)
Якое ласкавае імя хлопчыка расце ў жыце? (Васілёк.)
Чатырма літарамі напішы выраз "сухая трава". (Сена.)

**Шосты этап. "Прыказкі і прымаўкі".**



*Удзельнікі творчай групы нагадваюць прыказкі і прымаўкі, а заканчваць іх даюць магчымасць дзецям. Напрыклад:*

Родная зямелька як зморанаму... (пасцелька).
Родная зямля мякчэйшая за чужую... (пярыну).
Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай... (крыніцы).
Усюды добра, а дома... (найлепш).

**Сёмы этап. "Вітанкі і зычанні".**

*Удзельнікі творчых труп звяртаюцца адзін да аднаго са словамі вітання і зычання на роднай мове. Напрыклад,*

"Добры дзень вам!", "Дзень добры ў хату!", "Добрага ранку!", "З панядзелкам вас (аўторкам і г. д.)!", "Здаровенькі былі!", "Мае вам шанаванне!", "Будзьце жывы, здаровы!", "Жывіце з богам", "Будзьце жывенькі, здаровенькі!", "Каб вам вялося!", "Лавіся, рыбка, малая і вялікая!", "Сакалінага лёту!", "У добры час!", "Удачы!", "Шчасліва!", "Час добры на дарогу!", "У добры час кажучы" і інш.

**Восьмы этап. "Гульні".**

*Вядучы абвяшчае, што ў куфэрку засталіся народныя гульні. Звяртаецца да астатніх з пытаннем: хто ведае, у якія гульні гулялі бабулі, дзядулі, а то і прабабулі, і прадзядулі? Прапануе арганізаваць гульню. Калі нічога не атрымліваецца, арганізуе сам. Гэта могуць быць гульні "У краскі", "Сляпы музыка" і інш.*

**Дзевяты этап. "Матуліна казка".**

*На гэтым этапе кожны павінен успомніць беларускую казку, якую яму расказвалі ў дзяцінстве. Мікракалектыў, члены якога рыхтавалі казкі, могуць прачытаць адну з іх па ролях ці падрыхтаваць інсцэніроўку беларускай казкі, напрыклад, "Лёгкі хлеб".*

**Парады арганізатарам:**
1. Правядзіце заняткі так, каб дзеці зразумелі, што паданні, забаўлянкі, жарты - духоўны скарб народа.

2. Заняткі правядзіце няспешна, размеркаваўшы матэрыял на некалькі дзён.
3. Да падрыхтоўкі заняткаў абавязкова падключыце бацькоў.

## III. Народныя гульні як элемент этнакультуры ў дзейнасці аб’яднанняў па інтарэсах мастацкага профілю

Народныя гульні заўсёды служылі крыніцай засваення культуры. Паняцце “гульнёвая культура” - мнагазначнае. Яе аснову складае непасрэдна гульнёвае дзейства і адносіны ўдзельнікаў гульні. Параўноўваючы традыцыйныя гульні Беларусі з гульнямі народаў свету, бачыш, наколькі яны самабытныя і разам з тым маюць шмат агульнага.

Гульня – шырока распаўсюджаны і эфектыўны сродак і метад выхавання ў народнай педагогіцы. У гульнях выражаюцца не толькі традыцыйныя віды працы, але і практычна ўсе бакі жыцця чалавека.

Яркі нацыянальны каларыт надае гульням шырокае выкарыстанне роднай мовы і фальклора: песень, лічылак, дразнілак, прымавак і г.д. Бясспрэчныя гуманнасць і дэмакратызм народных гульняў – яны прымаюць усіх жадаючых без выключэння.

Знаёмства з народнымі гульнямі ва ўстанове дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі адбываецца праз:

- заняткі аб’яднанняў па інтарэсах фальклорнага напрамку;
- выкарыстанне гульняў пры правядзенні свят і масавых мерапрыемстваў.

**Беларускія народныя гульні:**

**1. Міхасік**



Для правядзення гульні шэсць пар лапцей ставяцца ў кола. Сем удзельнікаў гульні размяшчаюцца вакол лапцей. Пасля вымаўленых вядучым слоў:
- Ты, Міхасік, не пазяхай, не пазяхай!
Лапці абувай, абувай!

Гучыць беларуская народная мелодыя. Усё прыскокамі або крокам беларускай полькі рухаюцца па коле.

Па заканчэнні музыкі ўсё спыняюцца і кожны імкнецца хутчэй абуць лапці. Дзіця, якое засталося без лапцей, выбывае з гульні. Прыбіраецца адна пара лапцей, і гульня працягваецца ды таго часу, пакуль застанецца адзін гулец. Ён і лічыцца пераможцам.

Гульцы абуваюць лапці толькі па заканчэнні музыкі. Рухацца па коле, складзеным з лапцей, трэба з яго вонкавага боку



**2. Іванка**

На грунце рысуюць кола дыяметрам

5 - 10 м. Гэта лес, а ў сярэдзіне квадрацік - дом лесавіка. У квадрат змяшчаюць Іванку і выбіраюць лесавіка. Астатнія - лебедзі.
Лебедзі, залятаючы ў лес, спрабуюць забраць Іванку, а лесавік - злавіць лебедзяў рукой або дакрануцца да іх дубчыкам. Лебедзь, якому ўдаецца вывесці з лесу Іванку, сам становіцца лесавіком, і гульня пачынаецца спачатку.
Правілы гульні. Забягаць у дом лесавіка нельга. Злоўленыя лебедзі выбываюць з гульні да змены роляў. Лесавік не мае права выходзіць з лесу і ўвесь час стаяць каля дома, ён павінен рухацца па пляцоўцы.

**3. Зайцы і тын**

Гульцы дзеляцца на дзве роўныя па сілам каманды - зайцы і тын. Рысуюць дзве паралельныя лініі - калідор шырынёй 10 - 15 см. Гульцы - тын, узяўшыся за рукі, становяцца ў цэнтры калідора, а зайцы - на адным з канцоў пляцоўкі. Дзеці - тын чытаюць:



Заяц, заяц, не хадзі
у наш зялёны агарод!
Тын, запляціся,
Зайцы лезуць, ратуйся!

На апошнім слове, зайцы бягуць да тына і імкнуцца разарваць яго ці праскочыць пад рукамі гульцоў. Зайцы, якія праскочылі, збіраюцца на іншым канцы калідора, а тым, каго затрымалі, кажуць:
Ідзі назад у лес, асінкі пагрызі!І яны выбываюць з гульні. Дзеці - тын паварочваюцца тварам да зайцоў і чытаюць:не ўвойдзе ў іншы раз, нас тын ад зайцоў выратаваў.

Гульня паўтараецца, пакуль не пераловяць ўсіх зайцоў. Пасля гэтага мяняюцца ролямі.

Перамагае тая група, якая пераловіць ўсіх зайцоў пры меншай колькасці запеваў.

**4. Мароз**



З дапамогай лічылкі выбіраецца Дзед Мароз:

Ты зялёны, ты чырвоны.
Ты ў футры, ты з поясам,
У цябе сіні нос,
Гэта ты, дзед Мароз!

Усе дзеці разбягаюцца, а дзед Мароз стараецца дакрануцца да кожнага гульца і замарозіць яго. Замарожаны стаіць нерухома. Разбягацца можна толькі пасля заканчэння лічылкі. У момант замарозкі можна прыняць усялякую паставу. Перамагае той, хто ні разу не трапіўся Дзеду Марозу.

**5. Заяц-месяц.**

Гульцы стаяць у коле. Вядучы і дзеці пачынаюць пераклічку:

- Заяц-месяц, дзе быў?
- У лесе.
- Што рабіў?
- Сена касіў.
- Куды клаў?
- Пад калоду.
- Хто скраў?
- Цур.

На каго падае слова цур, той даганяе дзяцей, а яны разбягаюцца ўроссып. Бегчы можна толькі пасля слова цур. Злоўленым лічыцца той, каго закрануў лавец.

**6. Пярсцёнак.**

Дзеці-гульцы стаяць у коле, трымаюць рукі наперадзе лодачкай. Выбіраецца адзін вядучы. У руках у вядучага ляжыць невялікі прадмет (гэта можа быць каменьчык, абгортка з фольгі). Вядучы ідзе па коле і кожнаму быццам кладзе яечка у рукі. Пры гэтым ён кажа:

Курыца-квактуха
Вадзіла дзяцей
Каля кляцей.
Квох - сесці
На красным месці,
Яечка знесці.

Аднаму з дзяцей ён незаўважна кладзе яечка, а потым выходзіць з кола і кажа:

Бочка-грэчка,
Каціся, яечка!

Той, у каго ў далонях выявіцца яечка, выбягае, а дзеці павінны пастарацца затрымаць яго, не выпусціць з кола.

Пасля слоў: «Бочка-грэчка, Каціся, яечка!» усё гульцы павінны паспець хутка ўзяцца за рукі, каб не выпусціць гульца з яечкам у руцэ з кола.

## Гульнявая праграма «Велікодныя забаўкі»

***Вядучы:*** Добры дзень, паважаныя! Ой, колькі прыгожых святаў ёсць у беларусаў. І вы, напэўна, ведаеце і святкуеце іх. Я ўпэунена, што свята Вялікдзень ведаюць усе. Зараз на вуліцы холадна, але мы ў сэрцы ўсе чакаем гэтае свята. Да гэтага свята мы доўга рыхтуемся і шмат гатуем прысмакаў. І зараз мы з вамі ўспомнім, што павінна абавязкова быць стале ў гэты святочны дзень?

*(Гледачы адказваюць)*

***Вядучы:*** Так, правільна, яйкі. А яшчэ, акрамя яек, ад якой стравы і прысмакаў аж трашчаць сталы на Вялікдзень?

Напярэдадні Вялікдня людзі гатуюць святочныя стравы. Іх на стале павінна быць не менш як дзевяць. У той час, як маці замешвала цеста, пякла бліны, гатавала святочную куццю, дзеткі гулялі ў розныя гульні, што перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Можа быць, хто-небудзь ведае такія гульні?

Сёння я навучу вас гуляць у некаторыя з іх. Па назве вы можаце здагадацца, як у іх гуляць.

*Праводзіцца гульня **"Катанкі".***

Умовы гульні вельмі простыя. У кожнага удзельніка ў руцэ павінна быць яйка. Усе ўдзельнікі становяцца ў шарэнгу і па камандзе з усёй сілы кідаюць яйка наперад. Галоўная ўмова: яйка павінна каціцца па зямлі. Чыё яйка спыніцца найдалей, той і выйграў.
*(Дзеці коцяць яйкі, а вядучы вызначае пераможцу ў гэтай гульні.)*

*Праводзіцца гульня **"Перакаці яечка".***

Для правядзення гульні удзельнікі дзеляцца на некалькі каманд (дзве-тры). Насупраць кожнай каманды на крэсле стаіць талерка, каля талеркі ляжыць вялікоднае яйка. Па камандзе вядучага кожны удзельнік па чарзе павінен перакаціць яечка вакол талеркі. Без дапамогі рук. Якая каманда хутчэй перакоціць яечка, тая і пераможца.

*Праводзіцца гульня **"У які бок"***

На крэсле пад талеркай ляжыць яйка,удзельнікам гульні трэба пакласці саломінку ў той бок, у які накіравана само яйка.

*Праводзіцца гульня **"Хапанкі".***

У гэту гульню можа гуляць шмат дзяцей. Удзельнікі становяцца ў кола па 7-10 чалавек. Такіх колаў можа быць некалькі. У аднаго гульца ў руцэ яйка. Па камандзе удзельнікі перадаюць яйка дакладна ў рукі гульцу, што стаіць поплеч. Як толькі яйка вяртаецца да першага удзельніка, усе дзеці крычаць: "Усё!" (Дзеці, становяцца ў кола і спрабуюць гуляць).

*Праводзіцца гульня **"Біткі".***

Удзельнікі павінны стукацца яйкамі. Спачатку, гульцы "б'юцца" мыском, а затым пяткай. Чыё яйка мацнейшае, той і пераможца.Удзельнік, у якога яйка пабілася з двух бакоў, пакідае гульню. Пераможца забірае яйка.

***Вядучы:*** Дзякуй усім за ўвагу і ўдзел у нашай праграме. Да пабачэння!
Усім вам "ХРЫСТОС УВАСКРЭС".

# Заключэнне

У мастацкім накірунку дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі няма ні аднаго напрамку, які б не даваў магчымасці выкарыстоўваць элементы этнічный культуры для маральна-эстэтычнага выхавання дзяцей і падлеткаў.

Этнакультурнае выхаванне будуецца, пачынаючы з кагнітыўнага засваення навучэнцамі элементаў этнічнай культуры, затым пераходзіць да фарміравання на іх базе характэрных адносін да навакольнага асяроддзя і да самога сябе, і заканчваецца канкрэтнымі паводзінамі, канкрэтнай дзейнасцю, якія адпавядаюць каштоўнасцям дадзенага этнасу.

Эфектыўнасць працэсу этнакультурнага выхавання павінна вызначацца не толькі ў рашэнні агульных задач, звязаных з выхаваннем культуры міжнацыянальных зносін, але і вызначэннем індывідуальных траекторый развіцця дзяцей, уліку інтарэсаў, магчымасцей і патрэбнасцей кожнага дзіця ў пазнаваўчай сферы, творчым праяўленні, сацыяльным развіцці. Абавязковай умовай выхавання эстэтычнай культуры ва ўстанове дадатковай адукацыі дзяцей  і моладзі павінна стаць выхаванне без прымушэння, што абумоўлена прынцыпамі дадатковай адукацыі – дабраахвотнасцю навучання і свабодай выбару (віду дзейнасці, педагога, рэжыму навучання).

Навучэнцы аб’яднанняў па інтарэсах мастацкага профілю маюць магчымасць для рэалізацыі атрыманага вопыту ў практычнай грамадска значымай дзейнасці: на канцэртах, конкурсах, фестывалях, выступленнях, выставах. Гэта асаблівасць дадатковай адукацыі мастацкага профілю дазваляе развіваць навучэнцам мэтанакіраванасць, самакантроль дзейнасці, імкненне даводзіць пачатае да канца і самакрытычнасць у ацэньванні сваіх рэзультатаў. Сумесная работа развівае гатоўнасць да супрацоўніцтва, узаемадапамогі і ўзаемнай падтрымкі, беражлівыя адносіны да зместу, удзельнікаў і вынікаў калектыўнай дзейнасці. Грамадская ацэнка вынікаў дзейнасці вызывае пачуццё задавальнення, эстэтычныя адносіны да дзейнасці паступова фарміруе здольнасць падыходзіць да ацэньвання з’яў рэчаіснасці і мастацтва з эстэтычнай мерай.

Існуюць дзве галоўныя памылкі ў далучэнні навучэнцаў да каштоўнасцей этнічнай культуры. Першая заключаецца ў эпізадычнасці, фрагментнасці гэтай работы.  Другая – у адносінах да этнічнай культуры як архаічнасці, “музейнай рэдкасці”, яе элементамі “ўпрыгожваюцца” асобныя мерапрыемствы і праявы сучаснай культуры. Народнай культуры часцей за ўсё адводзіцца месца на сцэне і ў музеі. Інтэграцыйныя працэсы этнакультурнага выхавання павінны пранізваць усю дзейнасць, далучаючы навучэнцаў да культурных народных традыцый.

Кожны творча працуючы педагог у стане стварыць сваё праблемнае поле кіраўніцтва духоўным самаразвіццём навучэнца. Само жыццё ставіць перад педагогам новыя праблемы, падказвае іншыя формы работы, прымушае шукаць новыя падыходы і метады выкарыстання культурнай спадчыны народа.

Вяртаючы да жыцця народныя святы і абрады, праводзячы лекцыі-прэзентацыі, майстар-класы і конкурсы, навучэнцы не толькі спасцігаюць этнакультурную самабытнасць беларусаў, але і робяць крокі ў сваім самапазнанні, ва ўсведамленні сябе грамадзянамі, адказнымі за лёс і будучыню сваёй Бацькаўшчыны.

**Літаратура для выкарыстання:**


1. Асокіна, Т.І , Кенеман, А.В. Дзіцячыя народныя рухомыя гульні: Кн. для выхаваццеляў садочкаў і бацькоў / Т.І Асокіна, А.В. Кенеман. – М.: Навука і выхаванне; 1995. - 224 с.
2. Бандарчык, В.К. Народная педагогіка беларусаў / пад рэд. В.К. Бандарчыка [і інш.]. – Мінск, 1996.
3. Бандарчык, Е. Беларускае народнае адзенне/ Бандарчык Е. - Мн., 1975.
4. Беларускія народныя тканіны - Мн., 1979.
5. Веткаўскі музей народнай творчасці. - Мн.: Беларусь, 1994.
6. Герчук, Ю. Я. Что такое орнамент: структура и смысл орнаментального образа - М., 1998.
7. Де Моран А. История декоративно-прикладного искусства: Пер. с фр.- М.: Искусство, 1982.
8. Кабашнікаў, К.П. Беларускі фальклор: хрэстаматыя / склад. К.П. Кабашнікаў [і інш.]. – Мінск: Выш. шк., 1977. – 840 с.
9. Касцюкавец, Л.П. Беларускія народныя абрады / склад., навук. рэд. і прадмова Л.П. Касцюкавец. – Мінск: Беларусь, 1994. – 128 с.
10. Кацар, М. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка/ М.Кацар. – Мн., 1996.
11. Коваль, У.І., Новак, В.С, Беларускія народныя святы і звычаі/ У.І.Коваль, В.С Новак.— Гомель, 1993;
12. Кочева, Т.В."Машинное орнаментирование"/ Т.В. Кочева [и др.]. – Улан - Удэ, 1999.
13. Курыловіч, А.Н. Беларускае народнае ткацтва/ А.Н. Курыловіч. – Мн., 1981.
14. Лозка, А. Беларускі народны каляндар. Складальнік Алесь Лозка. — Мн., 1993.
15. Мядуначка. Беларускія народныя песні / Скл. А.Ф. Кашпур, К.Я. Ігнацьева. – Мн., 2004.
16. Прускі, М. Беларускі арнамент/ М.Прускі. – Мн., 1979.
17. Раманюк, М. Беларускае народнае адзенне. Альбом - Мн., 1981.
18. Сахута, Я. Народныя мастацкія рамествы Беларусі/ Я.Сахута. – Мн.: Беларусь, 2001.
19. Сахута, Я. Беларускае народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва/ Я.Сахута. – Мн.: Беларусь, 2001.
20. Сахута, Я. Беларускае народнае мастацтва. Альбом/ Я.Сахута. – Мн.,1980.
21. Сахута, Я. Народнае мастацтва Беларусі/ Я.Сахута. – Мн., 1997.
22. Селівончык, В. Беларускія паясы/ В.Селівончык.л – Мастацтва Беларусі, 1988, №10.
23. Соколова Т. Орнамент - почерк эпохи - Л.: Аврора, 1972.
24. Ткацтва, каўрадзелле, вышыванне, вязанне, набойка. Музей беларускага народнага мастацтва. Альбом - Мн., 1983.
25. Фадзеева, В. Беларуская народная вышыўка/ В.Фадзеева. – Мн., 1990.

26.Фадзеева В. Беларускі ручнік/ В.Фадзеева. - Мн., 1994.

## Літаратура

1. Арлова, Г.П. Народная педагогіка як сродак выхавання вучняў: дамап. для педагогаў агульнаадукац. устаноў і ўстаноў пазаш. выхавання і навучання / Г.П. Арлова. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2009. – 144 с.
2. Конан, У.М. Ля вытокаў самапазнання: Станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору / У.М.Конан. – Мн.: Мастацкая літаратура,1989. – 238с.
3. Конан, У.М. Фальклор як мастацкая сістэма і яго актуалізацыя ў адукацыі / У.М.Конан // Адукацыя і выхаванне. – 2008. – №7. – с.61-68.
4. Кухаронак, Т.І. Роля традыцыйнай культуры беларусаў у сучасным выхаваўчым працэсе / Т.І. Кухаронак // Народная спадчына Бацькаўшчыны: вывучэнне спадчыны і выхаванне дзяцей сродкамі аўтэнтычнага народнага мастацтва: Матэрыялы фальклорных чытанняў / Т.І. Кухаронак. – Мн.,выд."Чатыры чвэрці", 2002. – с.54-59.
5. Пладунова, Т.А. Фальклор як экасістэма культуры (Да пытання этнакультурнага выхавання дзяцей і моладзі) / Т.А.Пладунова // Традыцыйная культура і дзеці: праблемы захавання і пераемнасці: Зборнік матэрыялаў навукова-практычнай канферэнцыі / Т.А.Пладунова. – Мазыр: МазДПі імя Н.К.Крупскай, 2001. – с. 3-6.
6. Салееў, В.А. Этнапедагогіка і эстэтычнае развіццё асобы / В.А.Салееў. – Мн.: 1994. – с.181.
7. Традыцыйная культура і дзеці: праблемы захавання і пераемнасці: Зборнік матэрыялаў навукова-практычнай канферэнцыі. – Мазыр: МазДПі імя Н.К.Крупскай, 2001. – 141с.
8. Шчадрына, Э. В. Творчае развіццё дзяцей і моладзі ў працэсе этнакультурнага выхавання (на прыкладзе шчомысліцкага гурта "Явар") / Эвеліна Шчадрына // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зборнік навуковых прац удзельнікаў VI Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 27-29 красавіка 2012 г.) / Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. - Мінск, 2012. - с. 136.